153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 113 (5437)
СЕРАДА
20 МАЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

БССР ЗАВЯРШЫЛА СЯЎБУ

МЕНСК, 19 мая (БелТА). 15 мая Беларусь закончыла сяўбу ўсіх культур (за выключэннем позніх — проса, грэчкі, агародніх) на 100,8 проц. Пасеяна па ўсіх сектарах 2.262 тыс. га пры плане (разам з познімі) у 2.473 тыс. га. Сяўба праведзена ў сціслыя тэрміны.

Тав. ДЗЕМ'ЯНУ БЕДНАМУ

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР вітаюць вас у дзень 25-годдзя вашай большэвіцкай літаратурнай дзейнасці. 25 год вы з гонарам несяце сцяг паэта-большэвіка, чыё жыццё і вялікі талент адданы справе рабочага класа і сялянства.

Прапоўныя Совецкага Саюза ведаюць і высока цэняць вашы творы, пранікнутыя гарачай адданасцю справе Леніна і рэвалюцыйнай нянавісцю да ворагаў рабочага класа.

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР жадаюць вам доўгіх гадоў жыцця і далейшых поспехаў у вашай творчай рабоце.

СНК САЮЗА ССР **ЦК ВКП(б).**

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

Совецкая Беларусь атрымала новую бліскучую перамогу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. 15 мая закончыла веснавую сяўбу.

Сяўба ў гэтым годзе прайшла ў выключна сціслыя тэрміны і высокаякасна.

Што забяспечыла поспех веснавой сяўбы гэтага года?

Рашаючым фактарам з'явілася сацыялістычнае спаборніцтва Беларускай ССР з Кіеўскай і Чэрнігаўскай абласцямі. У гэта спаборніцтва ўключыліся мільёны калгаснікаў. У барацьбе за завяванне першынства разгарнулася магутная хваля стаханаўскага руху — гэтай вышэйшай формы сацыялістычнага спаборніцтва.

Іменна ў гэту веснавую пасеўную кампанію, ажыццяўляючы ўказанні вялікага Сталіна аб чулым, беражным выхаванні і вырошчванні кадраў, вызначаліся сваёй работай выдатныя людзі — стаханаўцы, паказаўшыя ўзоры гераічнай работы.

Кадры, большэвіцкае кіраўніцтва імі нашай партыяй рашылі поспех сяўбы.

Ордэнаносцы стаханаўцы — знатныя людзі Совецкай Беларусі тт. **Блоцкі** і **Юхновіч** з калгаса імя Варашылава, т. **Буглай** з Сенненскага раёна, **Драгун** з Грэскага раёна, **Прорвіч** з соўгаса «10-годдзе БССР» і інш. гераічна змагаліся за паспяховае выкананне плана, паказвалі ўзоры большэвіцкай работы, дапамагалі адстаючым падцягнуцца да ўзроўню перадавых.

Стаханаўскі дэкаднік трактарыстаў БССР узняў на велізарную вышыню творчую ініцыятыву мас трактарыстаў, якія паказалі ўзоры таго, што можа даць тэхніка, калі яна знаходзіцца ў надзейных, вопытных руках.

Трактарысты-стаханаўцы тт. **Пяньноўскі** і **Рудзеня** засявалі на трактары ХТЗ па 68—69 гектараў у дзень кажнапель.

Трактарысты-стаханаўцы **Сарачынскі, Аладко, Ахрамовіч, Чубакоў** і інш. сістэматычна на некалькі сопень процантаў перавыконвалі планы, узорваючы за 10 гадзін па 14—16 і нават 20 гектараў на трактары ХТЗ.

Некаторыя ныцікі і малаверы ў сваіх разліках аб вытворчай магутнасці трактара не верылі, што ён можа даць такую прадукцыйнасць. Стаханаўскі рух унёс карэктыву ў вытворчую магутнасць трактара і паказаў, што калі за рулём сядзіць чалавек праверані, тэхнічна граматны і вопытны, то трактар можа рабіць цуды.

Рост людзей, рост іх творчай ініцыятывы, рост палітычнай актыўнасці, беззаветная адданасць мас калгаснікаў справе **Леніна—Сталіна** — вось што самае каштоўнае, самае выдатнае, калі мы падводзім вынікі веснавой сяўбы.

Толькі на аснове ўзрослай актыўнасці і свядомасці калгасных мас, на аснове іх адданасці калгаснаму ладу маглі мы дабіцца такіх бліскучых перамог у гэтым годзе.

Выкананне плана сяўбы Беларускай ССР зусім не азначае, што ў нас ва ўсіх раёнах, усіх калгасах справа стаіць здавальняюча, што мы можам «пачываць на лаўрах».

Наадварот, чым большыя нашы поспехі, чым большыя прад'яўляюцца да нас патрабаванні, тым патрабоўней мы павінны быць да адстаючых раёнаў і калгасаў.

Нельга дапусціць такога становішча, калі некаторыя раённыя кіраўнікі хочуць сваю бяздзейнасць, няўменне кіраваць масамі схаваць за сярэднімі рэспубліканскімі лічбамі выканання плана.

Узяць хоць-бы к прыкладу такія раёны, як **Суражскі, Сіроцінскі, Чэрыкаўскі, Шклоўскі** і іншыя. Гэта пераважна раёны, дзе план сяўбы ранніх зернавых яшчэ не выканан.

«Звязда» паведамляла ўжо, што ў гэтых і ў некаторых іншых раёнах яўна нядобра стаіць справа з разгортваннем стаханаўскага руху, што там кіраўнікі слаба працуюць з масамі калгаснікаў, не пераносяць вопыт перадавых у адстаючыя, не падцягваюць адстаючых да ўзроўню перадавых.

Нельга далей цярпець такога становішча, каб у ордэнаноснай рэспубліцы былі раёны, якія сістэматычна за невыкананне планаў сяўбы і другіх сельскагаспадарчых работ заносяцца на чорную дошку.

Кіраўнікі раёнаў абавязаны перабудавацца так, каб уся асноўная іх увага была звернута на работу з людзьмі, на падняцце сацыялістычнага спаборніцтва і яго вышэйшай формы — стаханаўскага руху.

У ордэнаноснай БССР не павінна быць ні аднаго адстаючага калгаса і сельсавета, а тым больш раёна. У нас ёсць усе ўмовы к таму, каб кожны калгас, сельсавет, раён працаваў так, як працуюць перадавыя раёны. Па іх мы павінны раўняць увесь фронт.

Завяршэнне плана сяўбы ў БССР з'яўляецца толькі першым этапам у барацьбе за высокі сталінскі ўраджай.

Зараз, побач з барацьбой за завяршэнне плана сяўбы кожным калгасам, аднаасобным двaром, побач з поўным завяршэннем сяўбы позніх культур, трэба галоўную ўвагу звярнуць на поўнае захаванне пасеваў, на праполку і ўзняцце цаліны і папараў.

Уберагчы ўраджай ад пустазелля і шкоднікаў, даць патрэбную падкормку пасевам, дасканала правесці ўзняцце цаліны і папараў, па-большэвіцку рыхтавацца да ўборачнай — важнейшыя задачы кожнага кіраўніка раёна, сельсавета, калгаса.

Велізарнейшыя задачы, якія стаяць перад намі па паспяховаму завяршэнню ўсіх сельскагаспадарчых работ гэтага года, могуць быць выраішаны толькі ў тым выпадку, калі мы і ў далейшым яшчэ больш разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва і яго вышэйшую форму — стаханаўскі рух у кожным калгасе, брыгадзе і звяне. Іменна ў гэтым заключаецца поспех барацьбы за высокі сталінскі ўраджай.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта і вялікага **Сталіна** КП(б) Беларусі на чале са стойкім кіраўніком тав. **Гікало** вядзе працоўныя масы да перамогі да перамогі.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і нашага роднага вялікага **Сталіна** большэвікі і калгаснікі Совецкай Беларусі з гонарам справяцца з тымі задачамі, якія пастаўлены вялікім **Сталіным** у барацьбе за атрыманне высокіх ураджаяў з сацыялістычных палёў.

ТАВ. ГІКАЛО НА БУДАЎНІЦТВЕ МЕНСКАГА ПАЛАЦА ПІОНЕРАЎ

Учора днём будаўніцтва менскага Палаца піонераў наведаў сакратар ЦК КП(б)Б таварыш **Гікало**. Разам з ім будаўніцтва наведалі загадчык прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б тав. **Готфрыд**, сакратары ЦК ЛКСМБ тт. **Аўгустайціс** і **Манаеў**, член бюро ЦК ВЛКСМ тав. **Мускін**, нарком асветы БССР тав. **Дзякаў**, намеснік наркома асветы тав. **Гершон** і інш.

Таварыш Гікало азнаёміўся з ходам будаўніцтва Палаца і цікавіўся знадворнай і ўнутранай яго аддзелкай і абсталяваннем. Работнікам будаўніцтва тав. Гікало даў рад каштоўных заўваг і ўказанняў. Тав. Гікало прапанаваў, каб да адкрыцця каля Палаца разбіць парк з выхадам да рэчкі.

УДЗЕЛЬНІЦЫ УСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЫ ЖОНАК ГАСПАДАРНІКАЎ І ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ У «ЗВЯЗДЗЕ»

Учора ў рэдакцыі газеты «Звязда» адбылася сустрача ўдзельніц усесаюзнай нарады жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў тт. **Лоскат** (жонка майстар завода імя Варашылава) і **Урэцкай** (жонка інжынера завода імя Кірава), з жонкамі гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і стаханаўцаў менскіх прадпрыемстваў.

З вялікай цікавасцю былі выслуханы расказы таварышоў Лоскат і Урэцкай аб усесаюзнай нарадзе, аб велізарным уздыме, з якім 3000 удзельніц нарады сустралі любімага правадыра народаў таварыша Сталіна.

На нарадзе выступіў нарком мясцовай прамысловасці таварыш **Бальцін**, а таксама жонкі гаспадарнікаў, інжынераў, тэхнікаў тт. **Разоўская, Райцэс, Айзман, Столяр, Бэкман, Гайнч, Ерэнгроз, Краснікава, Філатава.**

РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ ПРАПОЛКУ ВА УСІХ РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

НА ПРАПОЛЦЫ

УШАЧЫ, 19 мая. (**По тэлефону**). Перадавы калгас «Новы шлях», Сарачынскага сельсавета, скончыў першую праполку ільну. Звенняя Акера Прося па-ўзорнаму арганізавала работу на праполцы. Усе палольшчыцы яе звяна былі правільна расстаўлены, да кожнай даведзена індывідуальная здзельшчына.

Усё звяно Просі працавала на праполцы па-стаханаўску. Замест нормы 0,15 гектара кожная палольшчыца давала за дзень па 0,34 гектара.

Калгас «Новы шлях» пераключыўся на праполку азімай пшаніцы і жыта.

Першую праполку ільну скончыла звяно Булы з калгаса «Новыя Турасы». Звяно заняла першае месца ва ўсім калгасе. Якасць праполкі добрая. На пасевах не застаецца ні аднаго каліва пустазелля.

Следам за перадавымі брыгадамі і звеннямі праполку ільну разгарнула большасць калгасаў раёна.

ЛОГВІНАЎ.

***

ХОЙНІКІ. (**По тэлефону**). Усе калгасы раёна полюць азімыя культуры. Першымі скончылі праполку азімай пшаніцы калгасы «Пролетарый № 1», «XVII партз'езд», імя Войкава, імя Варашылава і шмат іншых.

Праполкі праводзіцца звеннямі. За звяном замацоўваюцца ўчасткі. У калгасе «Пролетарый № 1» першым па праполцы ідзе звяно Чэркас Марылі. Звенняя арганізавала выхад на работу ўсіх жанчын. Перад праполкай у калгасе адкрыты яслі і дзіцячая пляцоўка.

ПУГАЧ.

ПАЧАЛІ ПАЛОЦЬ КОК-САГІЗ

112 гектараў каўчуканоса кок-сагізу засеяна гэтай вясной у калгасах рэспублікі. Восенню мінулага года засеяна 60 гектараў кок-сагізу.

Каўчуканосы далі добрыя ўсходы. Пачалася праполка і апрацоўка міжрадзяў. Калгас «Перамога», Буда-Кашалёўскага раёна, скончыў першую праполку.

Аграном смалявіцкага райза тав. Філін сканструяваў ручны палольнік для міжрадковай праполкі кок-сагізу. Палольнік, які павышае прадукцыйнасць працы у 10 раз, прымяняецца ў калгасе «Парыжская комуна». (БЕЛТА).

ЗАСЛАУСКАЯ МТС — ТРАКТАРНАЯ БРЫГАДЗЕ, РАЧКОУСКАЯ МАРЫІ

РАД АДЗНАЧЫЦЬ БОЛЬШЭВІЦКУЮ РАБОТУ ЖАНОЧАЙ БРЫГАДЫ. У РУКАХ БЕЛЬСКАЙ НІНЫ, БАРТАШЭВІЧ АЛЕСІ, ЛАБАЧЭЎСКАЙ ТРАКТАР З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПАСЛУХМЯНАЙ ВЫДАТНАЙ ЗБРОЯЙ У БАРАЦЬБЕ ЗА СТАЛІНСКІ ЎРАДЖАЙ.

ЖАДАЕМ ПОСПЕХАЎ У ДАЛЕЙШЫМ.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

НАПЕРАДЗЕ ТРАКТАРЫСТЫ ЧУБАКОЎ І ЯЧМЯНЁЎ

ХОЦІМСК. (**По тэлеграфу**). На 15 мая па Хоцімскай МТС, якая поўнасцю выканала план веснавых работ, выпрацоўка на кожны трактар складае 210 гектараў. Наперадзе ідуць брыгады **Кавалёва** і **Чэчыка**. У брыгадзе Кавалёва на кожным трактары выпрацавана 310 гектараў, Чэчыка — 288 гектараў і Садоўскага — 262 гектары.

Знатныя трактарысты **Чубакоў** і **Ячмянёў** — удзельнікі ўсесаюзнай нарады перадавікоў ураджайнасці — па-баявому выконваюць свае абавязацельствы. Трактарыст **Чубакоў Раман**, які абавязаўся ўзараць на трактары «ХТЗ» 1.600 гектараў, ужо выпрацаваў 387 гектараў і Ячмянёў — 343 гектары. Следам за імі ідуць трактарысты **Іванцікаў** (узараў 349 гектараў), **Гарадашнікаў** (узараў 324 гектары).

Змагаемся за першынства з Капыльскай МТС.

Дырэктар МТС ШЫЛЕЙКА.

МЕСЯЧНАЯ ВЫПРАЦОЎКА ТРАКТАРЫСТА-СТАХАНАЎЦА

У час веснавых работ я дабіўся высокай прадукцыйнасці работы на трактары. Замест нормы засеяць 10 гектараў, я засяваў 43,3 гектара. На рассеве ўгнаення я давёў выпрацоўку трактара ў сваю змену да 63,6 гектара.

У гэтым нічога дзіўнага няма. Я ведаю, што трактарысты суседняга соўгаса імя X-годдзя БССР тт. **Пеньноўскі** і **Рудзеня** далі яшчэ больш высокую выпрацоўку. Многія трактарысты Капыльскай, Старобінскай і іншых МТС БССР высока ўзнялі прадукцыйнасць работы трактара.

Поспеху ў сваёй рабоце я дабіўся ў выніку добрага аўладання трактарам. Мною добра вывучана машына і ўвесь прычэпны інвентар. Я скарыстаў цягавую сілу трактара, яго хуткасць з вялікай тонкасцю. Трактар у мяне не прастойваў, не ведаў паломак або аварый. Кожны раз добра аглядаўся, змазваўся.

Прычэпны інвентар таксама заўсёды быў у спраўнасці, падрыхтаваны для работы.

Вялікае значэнне ў паспяховай рабоце меў падбор участкаў. Рабочае месца мне было вядома, калі я заступаў на сваю змену, як мае пяць пальцаў. У падборы ўчасткаў мне дапамагалі загадчыкі ўчасткаў. За некалькі дзён падбіраліся ўчасткі, дзе павінен працаваць мой трактар.

Дасягнутая мною выпрацоўка не з'яўляецца гранню. Я рашыў не толькі не зніжаць тэмпы, а, наадварот, яшчэ вышэй узняць прадукцыйнасць работы свайго трактара.

За красавік месяц я зарабіў 1.412 рублёў і атрымаў прэміі на агульную суму 450 руб. А разам за месяц — 1862 руб. Я жыву весела і заможна.

АХРАМОВІЧ МАКСІМ,
трактарыст луггаса «Загалле», Любаньскага раёна.

ПАПАРЫ СЕННЕНШЧЫНЫ ЗАРАСТАЮЦЬ ТРАВОЙ

СЯННО. Ранняе ворыва папару ў раёне ігнаруецца. Толькі лічаныя калгасы пачалі ворыва. Калгас «Новасёлкі» ўзараў усяго 1 гектар, «Перакова» — 5 гектараў, «Малы Азярэц» — 7 гектараў. Астатнія калгасы не ўзаралі ні аднаго гектара.

Трактарны парк яшчэ не пераключаны на ворыва папару. Усяго другі дзень як працуюць на папары пяць трактараў.

З першых-жа дзён трактар у брыгадзе № 3, на якім працуюць трактарысты Ісакаў Іван і Рублёўская, выбыў са строю. Трактарысты не забяспечаны рамонтным інвентаром.

МТС з першых дзён работы асобных трактараў на ворыве папараў не забяспечыла канкрэтнай дапамогі трактарыстам.

Райзямаддзел не кіруе арганізацыяй падняцця папараў.

ЗВЯНО НА ПРАПОЛЦЫ

Раніцай, калі на жыце яшчэ не абсохла раса, звяно Алесі Міхалевіч вышла на праполку. Жанчыны, якія маюць малых дзяцей, паспелі адней аднесці іх у яслі. У першы дзень звяно дружна, без ніякага спазнення, прыступіла да работы.

Звенняя расставіла сваіх палольшчыц па загонах. Загоны былі роўныя, засмечанасць невялікая.

— Норма, як я вам гаварыла, жанчыны,—25 сотак. Хто праполе больш, таму больш запішам.

Палольшчыцы пазасоўвалі за пояс фартухі, каб лаўчэй збіраць пустазелле, і рассыпаліся па шырокаму зялёнаму полю.

Алеся заняла першы загон з боку. Па левую руку, нібы ланцугом, распягнулася яе звяно. Жанчыны старанна выбіраюць пустазелле. Звенняя раз ад разу заглядае на жанчын. Вось побач з ёю раўнялася маладая палольшчыца Няхайчык Ніна. Толькі намервалася Алеся загаварыць з ёю, як Ніна перабіла:

— Глядзі, цётка Алеся, каб я цябе не апярэдзіла. Адстанеш, звенняя, тады мне будзе соромна за цябе.

Звенняя Алеся ў адказ усміхнулася, і адагнуўшыся ад загона, рашыла пабачыць, як полюць яе жанчыны.

— А вось пакажы, Ніна, колькі ты напалола пустазелля. Я буду ўлічваць работу не толькі па прапалачнай плошчы, але і па якасці. А за якасць гаворыць колькасць наполатага.

Палольшчыцы паказваюць звенняй, хто колькі напалоў пустазелля. Яна яшчэ раз прайшла па полю і пераканалася, што ззаду нічога не застаецца, вярнулася на свой загон.

А вечарам усё звяно з песнямі ішло дамоў. Першы дзень праполкі прайшоў арганізавана і з вялікім поспехам. Кожная палольшчыца перавыканала норму. Брыгадзір Мікола Міхалевіч абышоў праполатыя загоны і ацаніў работу на добра.

***

Чысцімі выглядаюць пасевы. Першыя 7 гектараў праполатага азімага жыта яшчэ больш зазеляцелі і пашлі ў рост.

— Сёлета мы рашылі прапалоць усе азімыя і яравыя культуры, — гаворыць звенняя Алеся Міхалевіч. — Гэта значна павялічыць наш ураджай. Ні аднаго каліва пустазелля не пакінем у збажыне.

За ўраджай на справе змагаецца першае звяно 5 брыгады калгаса «Новы шлях», Астрашыцка-Гарадзецкага сельсавета (Менскі раён). Гэта звяно павінна прапалоць 30 гектараў азімых і 52 гектары яравых зернавых. Азімае звяно рашыла прапалоць за 7 дзён, Яшчэ некалькі дзён і першая праполка азімага жыта і пшаніцы будзе скончана.

Неўзабаве пачнецца праполка яравых. Лён узышоў добра. На сцябле ўжо з'явіліся 3—4 лісткі. Палоць лён звяно будзе не менш трох раз. Зернавыя-ж прапалоць па два разы.

Звяно змагаецца за якасць праполкі. Яно заняло першае месца не толькі ў брыгадзе, але і ва ўсім калгасе. У звяне прымяняецца індывідуальная здзельшчына. Палольшчыцы звяна Алесі Міхалевіч — Ганна Міхалевіч, Ніна Няхайчык, Мальвіна Міхалевіч, Ксеня Міхалевіч, Броня Лукашэвіч і Матруна Міхалевіч — цвёрда ўпэўнены, што ў барацьбе за высокі ўраджай таксама выйдуць першымі ў калгасе.

А. ЛОСЬ.

ПАЧАЛАСЯ МАСАВАЯ ПРАПОЛКА ЗЕРНАВЫХ

У калгасе «Новы шлях», Астрашыцка-Гарадзецкага сельсавета, Менскага раёна, разгарнулася масавая праполка зернавых. На здымку (злева направа): звенняя Міхалевіч Алеся, калгасніцы Няхайчык Зіна і Міхалевіч Ксеня на праполцы пшаніцы.

Фото Я. Салавейчыка.

У МУЗЕІ В. І. ЛЕНІНА

15 мая ў Маскве на плошчы Рэвалюцыі, побач з Краснай плошчай, у бліжэйшым суседстве з маўзолеем, адкрыўся Цэнтральны музей В. І. Леніна, у якім адлюстраваны яркія старонкі гісторыі барацьбы і перамог партыі Леніна—Сталіна. У першы-ж дзень музей наведала больш палутара тысяч чалавек — значна больш, чым намечана па плану музеем. Экспанаты музея агледзелі некалькі асобных экскурсій — прапагандысты Дзяржынскага раёна Масквы, прапагандысты Каломны, група чыгуначнікаў Ленінграда і інш. У адной з зал ішла асабліва ажыўленая гутарка сярод наведвальнікаў музея. Токар шарыкападшыпнікавага завода М. І. Бадроў, чый партрэт вісіць недалёка ад партрэта Ільіча, расказваў экскурсантам аб тым, як на яго кватэры ў Пецярбургу Владзімір Ільіч Ленін кіраваў у 1894 годзе марксісцкім рабочым гуртком. НА ЗДЫМКУ: тав. М. І. Бадроў (злева) гутарыць з наведвальнікамі музея.

Фото Ф. Кіслова (Саюзфото).

ДА СЕСІІ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

ГУТАРКА З ПРЭЗІДЭНТАМ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК АКАДЭМІКАМ І. З. СУРТА

Сёння адкрываецца чарговая сесія Беларускай акадэміі навук, якая абгаворыць рад навуковых і арганізацыйных пытанняў. Першым на парадку дня стаіць справаздачны даклад аб дзейнасці Акадэміі навук у 1935 годзе.

Беларуская акадэмія навук, — заявіў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» прэзідэнт Акадэміі навук акадэмік І. З. Сурта, — на працягу 1935 года правяла значную работу. Даволі ўказаць, што адных толькі друкаваных работ выпушчана Акадэміяй 122 назвы аб'ёмам у 738 друкаваных аркушаў. Сярод выкананых Акадэміяй работ ёсць рад такіх, якія маюць велізарнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Рад актуальных прац выпусцілі інстытуты грамадскіх навук. Да ліку гэтых работ трэба аднесці «Сялянскі рух на Беларусі ў эпоху феадалізма», аб пролетарскім інтэрнацыяналізме, «Эканомгеаграфія БССР» і інш. Значную работу правялі і інстытуты прыродазнаўчых навук, у прыватнасці ў галіне вышукання сыравінай базы для Прапойскага камбіната і эканамічнага ўгрунтавання гэтага камбіната, вывучэння запасаў торфу ў БССР і яго выкарыстання ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы і т. д.

Аднак, усё гэта ні ў якой меры не задавальвае тых патрабаванняў, якія прад'яўляюць партыя і совецкі ўрад. З 193 тэм, якія павінны былі быць выкананы інстытутамі Акадэміі ў 1935 г., выкананы ўсяго 132 тэмы.

Акадэмія была засмечана яшчэ значным лікам чужых і малакаштоўных у навуковых адносінах элементаў. Кіруючыя органы Акадэміі вялі недастатковую барацьбу з гэтымі варожымі, нацдэмаўскімі, трацкісцкімі, бундаўскімі, эсэраўскімі элементамі. Асноўным недахопам у рабоце Акадэміі ў мінулым годзе з'яўляецца адарванасць навукова-даследчых работ ад практычных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыя і ўрад аддаюць выключную ўвагу навуцы і развіццю навукова-даследчай работы. Урад БССР у мінулым годзе выдзеліў велізарныя сумы на развіццё навукова-даследчай работы. З іх Беларускай акадэміі навук было вызначана 5.299 тыс. руб.

Адрыў ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва, адсутнасць пастаяннай і арганічнай сувязі адпаведных інстытутаў з сельскай гаспадаркай, з калгасамі, соўгасамі, хатамі-лабараторыямі, няздольнасць, а часта і нежаданне абагуліць вопыт перадавых калгасаў, соўгасаў, прадпрыемстваў, вопыт стаханаўцаў — усё гэта адчувалася ў рабоце Акадэміі на кожным кроку.

Прычыны гэтага адставання Акадэміі ў зусім нездавальняючым кіраўніцтве работамі Акадэміі ў 1935 г. з боку прэзідыума, у безадказным даручэнні важнейшых участкаў работы выпадкова трапіўшым у Акадэмію людзям, коснасць і руціна, уласцівыя многім нашым работнікам, іх недастатковая кваліфікацыя, слабае разгортванне самакрытыкі ў сценах Акадэміі.

План Акадэміі, складзены на 1936 год, улічвае недахопы ў рабоце Акадэміі, якія мы адзначаем. Ён максімальна скарацілі тэматыку, высунулі найбольш важныя, вядучыя тэмы, маючыя вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне.

На парадку дня стаяць далей справаздачныя даклады двух інстытутаў аб іх рабоце: інстытута аграглебазнаўства і ўгнаення і інстытута гісторыі. Абодва інстытуты маюць у нашых умовах выключна вялікае значэнне.

Сесія дасць указанні адносна таго, у якім напрамку павінны весціся работы інстытута аграглебазнаўства і ўгнаення. На сесію запрошаны рад аграномаў, маючых вялікі практычны стаж, работнікі органаў Наркамзёма і прадстаўнікі навуковых арганізацый СССР. Яны дапамогуць нам выявіць нашы недахопы і наблізіць работу інстытута да практычных задач па выкананню ўказання таварыша **Сталіна** аб 7—8 мільярдах пудоў хлеба і падняцця ў сувязі з гэтым партыі і ўрада аб нечорназёмнай паласе.

Вялікае навуковае і практычнае значэнне будзе мець даклад інстытута гісторыі. Совецкай грамадскасці вядома, якую ўвагу аддаюць наша партыя і совецкі ўрад развіццю марксісцкай гістарычнай навукі і гістарычнай асвеце. ЦК ВКП(б) і Соўнарком СССР сваімі апошнімі рашэннямі паставілі рад актуальных задач перад гісторыкамі Совецкага Саюза. У якасці баявой задачы партыя і ўрад паставілі перад гісторыкамі перамаганне шкоднага ўплыву антымарксісцкіх установак школы Пакроўскага. Гэтыя ўстаноўкі знайшлі свой адбітак у работах і рада нашых гісторыкаў. Значным недахопам інстытута з'яўляецца таксама і тое, што мы не забяспечылі школы падручнікамі па гісторыі БССР. Таму мы прыцягваем і лічым мэтазгодным шырокі ўдзел настаўніцтва ў абгаварэнні справаздачы.

У парадку дня сесіі стаяць і арганізацыйныя пытанні. Сесія разгледзіць і зацвердзіць новы статут. Існуючы статут Акадэміі ўстарэў і не адпавядае ні тым задачам, якія стаяць перад Акадэміяй, ні зместу яе работы. Новы статут павінен быць па прыкладу статутаў акадэмій навук СССР і УССР баявым статутам, мабілізуючым навуковых работнікаў на будаўніцтва сацыялізма. Згодна новага статута будзе выбран новы прэзідыум.

На сесіі будуць праведзены выбары членаў-карэспандэнтаў Акадэміі па розных спецыяльнасцях.

Вось тыя важнейшыя пытанні, якія пастаўлены і павінны знайсці сваё вырашэнне на сесіі, якая сёння адкрываецца.

Партыйнае будаўніцтва

Райком і рэзерв

Правадыры нашай партыі таварышы **Ленін** і **Сталін** заўсёды з вялікай любоўю займаліся падборам і вырошчваннем партыйных кадраў. На XIII партыйным з'ездзе таварыш **Сталін** сказаў: «Ні ў якім выпадку нельга разглядаць кадры партыі як замкнутае нешта. Кадры павінны расцьвіцца крок за крокам за кошт партыйнага маладняка. Партыйны маладняк павінен папоўніць кадры. Без гэтага існаванне кадраў бяспадстава». Выконваючы ўказанні **Леніна** і **Сталіна**, наша партыя выхавала дзесяткі тысяч здольных і адданых партыйных работнікаў.

Пасля рашэння пленума ленінградскага гаркома ВКП(б) аб арганізацыйна-партыйнай і палітыка-выхаваўчай рабоце, райкомы партыі стварылі рэзерв партыйных кадраў. Шматлікія кадры рэзерва вылявілі райкомы і ў ходзе праверкі і абмену партыйных дакументаў. Многія з іх вылучаны на кіруючую работу.

Але ў працэсе падбору кадраў рэзерва ў некаторых раёнах мелі месца факты несур'ёзнага, фармальнага падыходу да гэтай важнейшай справы. У Магілеве ў рэзерв вылучылі людзей, якіх праз некаторы час прышлося выключаць з партыі. Такія факты мелі месца і ў Будзкашалёве. Неабходна памятаць, што адной з умоў стварэння кадраў рэзерва з'яўляецца правільны ўважлівы падыход да кожнага асобнага таварыша.

Але мала толькі вылучыць рэзерв, гэта поўсправы. Задача заключаецца ў тым, каб уцягнуць рэзерв у практычную работу, дапамагчы таварышам з рэзерва павышаць свой агульнаасветны і ідэйна-палітычны ўзровень.

Між тым, напрыклад, у Полацкім раёне толькі намецілі спіс рэзерва і на гэтым палічылі сваю місію скончанай. Ніякіх даручэнняў комуністам з рэзерва не давалі, нават ні разу іх не склікалі. Полацкі раён — не выключэнне. Адсутнічае работа з рэзервам у Барысаўскім, Чачэрскім, Нараўлянскім раёнах, у Менскай сталічнай арганізацыі і радзе іншых раёнаў Беларусі.

У лепшым выпадку райкомы піклуюцца, як таварышы з рэзерва вучацца. Але нельга забываць указання таварыша Кагановіча, што «большавік не школьнік, ён выхоўваецца палітычна, яго школьная вучоба злучаецца з палітыкай і практыкай штодзённай барацьбы».

Выхоўваць рэзерв абавязаны раённыя камітэты партыі. А гэта магчыма толькі тады, калі сістэматычна працаваць з рэзервам так, як вучыць партыя, як вучыць вялікі Сталін.

ПРАЦУЮЦЬ ПА-СТАРОМУ

Нараўлянскі райком партыі ў ходзе праверкі і абмену партыйных дакументаў далёка не ўсё зрабіў для таго, каб перабудаваць сваю работу і работу пярвічных арганізацый у адпаведнасці з указаннямі ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б. Аб гэтым ярка сведчыць той факт, што на пасяджэнні бюро райкома (да выбараў новага райкома) часта вырашаліся пытанні, якія з поспехам маглі быць вырашаны прэзідыумам райвыканкома. Зусім не заслухоўвалі на райкоме справаздачы парторгаў і самаправаздачы комуністаў.

Сходы пярвічных партарганізацый таксама перагружаюцца гаспадарчымі пытаннямі. Самаправаздачы комуністаў — рэдкае з'явішча.

— У плане работы мы вызначаем на нашы партыйныя сходы толькі гаспадарчыя пытанні, а партыйныя пытанні нам заўсёды рэкамендуе райком. Прычым райком часта рэкамендуе за 1—2 дні да схода, так што комуністы не паспяваюць добра падрыхтавацца да партсхода, — гаворыць парторг кандзіцерскай фабрыкі «Чырвоны мазыранін» т. Залатнік.

Зразумела, райком іншы раз можа рэкамендаваць пярвічным арганізацыям тое ці іншае пытанне для распрацоўкі на партсходзе. Але нельга дапускаць такога з'явішча, каб парторгі выключна чакалі прысылкі парадкаў дня партыйных сходаў з райкома.

Аслабла ў партыйнай арганізацыі з наступленнем летняга перыяда і партыйная вучоба. Есць выпадкі зрыву заняткаў партыйных школ і гурткоў. Зусім нізкая часамі і якасць вучобы. Куды варта, напрыклад, такое становішча, калі гурток павышанага тыпу па вывучэнню гісторыі партыі, у якім займаецца раённы партыйны актыў, працуе выключна па падручніку Кнорына. Ні адзін прапагандыст не рыхтуецца да заняткаў па першакрыніцах—творах **Леніна** і **Сталіна**.

Пры прыёме арганізацыі пасля праверкі партыйных дакументаў ЦК КП(б)Б указаў нараўлянскаму райкому на адсутнасць работы з беспартыйным актывам. Аднак, і дагэтуль такі важнейшы ўчастак работы знаходзіцца па-за ўвагай райкома партыі. Фармальна ў часе праверкі райкомам выяўлен і створан рэзерв беспартыйнага актыва ў колькасці 75 чал. Але з гэтымі людзьмі ніякай спецыяльнай работы не праводзіцца, ні адзін з іх на кіруючую работу не вылучан.

Таму зразумела, чаму ў Нараўлянскім раёне так марудна ідзе рост спачуваючых. На сёння іх налічваецца ўсяго 42 чалавекі, прычым групы спачуваючых арганізаваны далёка не пры ўсіх пярвічных арганізацыях.

З самімі спачуваючымі належнай работы па іх большавіцкаму выхаванню не вядзецца. Нават не ўсе спачуваючыя ўцягнуты ў палітгурткі, не гаворачы ўжо аб прыцягненні іх да партыйнай і грамадскай работы. Вось чаму сакратар райкома тав. Казачонак прымушан прызнацца, што якасць работы са спачуваючымі настолькі слабая, што зараз яшчэ нельга назваць ні адной кандыдатуры, якая была-б падрыхтавана да прыёму ў кандыдаты партыі.

Тое-ж самае можна сказаць і аб кандыдатах партыі. Іх у арганізацыі налічваецца 35 чалавек. Цяжка сказаць, ці гатовы яны да пераводу ў члены партыі. Нават тыя кандыдаты, якія былі пераведзены пры чыстцы 1933 года, таксама яшчэ не гатовы да пераводу ў члены. Тлумачыцца гэта тым, што асобнай работы з кандыдатамі партыі па іх падрыхтоўцы да пераводу ў члены ні райком, ні пярвічныя арганізацыі не праводзілі.

ФРАЛОЎ.

ОРДЭНАНОСЕЦ БУГЛАЙ ПАДАЎ ЗАЯВУ АБ ПРЫЁМЕ Ў СПАЧУВАЮЧЫЯ

СЯННО. Знаходзячыся зараз на курорце ў Ялце, ордэнаносец Ермалай Ягоравіч **Буглай**, нам. старшыні па ільну калгаса «Машкі», Пустынскага сельсавета, прыслаў у райком партыі пісьмо. У пісьме Буглай дзякуе комуністычнай партыі і таварышу **Сталіну** за большавіцкія клопаты аб працоўных і за радаснае і шчаслівае жыццё.

Разам з пісьмом Буглай прыслаў заяву аб прыёме яго ў спачуваючыя.

Ал. МАХНАЧ.

САМАДЗЕЙНАСЦЬ РАБОЧЫХ СОЎГАСАЎ

Сярод рабочых соўгаса «Чырвоны транспартнік», Менскага раёна, шырока развіта самадзейнасць. У соўгасе працуюць харавы, танцавальны, музычны, планерны і іншыя гурткі. НА ЗДЫМКУ: кукальны тэатр соўгаса на рэпетыцыі.

Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

БАГУШЭУСКІЯ УМОВЫ

(АД СПЕЦЫЯЛЬНАГА КАР. «ЗВЯЗДЫ»)

У канцы снежня 1935 года Багушэўскі райком партыі і райвыканком вылучылі дырэктара машканскай няпоўнай сярэдняй школы тав. Новікава Сямёна загадчыкам райана. Новікаў не з ахвотай ішоў на гэту работу — шкада было пакідаць работу ў школе, крыху сумняваўся ў сваіх здольнасцях кіравань школамі ўсяго раёна і не хацелася пераводзіць сям'ю з Машкан за 23 кілометры ў Багушэўск.

Але і ў райвыканкоме і РК КП(б)Б заяўнілі тав. Новікаву:

— Не бойся, справішся з работай. Мы табе дапаможам у рабоце, дамо зараз-жа кватэру... Жонку перавядзеш з машканскай школы ў багушэўскую... Будзеш жыць не горш, чым раней.

Ясна, што Новікаў, як член партыі, ды яшчэ пасля такіх абяцанняў РК і РВК не стаў адмаўляцца — прыняў раённы аддзел народнай асветы. Прыняў аддзел без адзінага работніка. Месяцаў два прапаваў выключна адзін, падбіраючы ў аддзел штат работнікаў. Прапаваў круглыя суткі, пакуль сям-так наладзіў работу ў райана, пакуль падабраў штат.

А райком і райвыканком так і забылі пра свае абяцанні. Не бачыць тав. Новікаў і па сёнешні дзень ні ад каго ў раёне дапамогі.

Дарма, што ў райвыканкоме ёсць легкавая машына, ёсць 10 коней (РВК — 3 кані, райза — 4 кані, райфінаддзел — 2 і райздраў — 1 конь), а Новікаў і яго работнікі вымушаны хадзіць па раёну пехатой.

— Мы не абавязаны райана вазіць па школах, хай дасць сродкі перасоўвання Наркомасветы, — заяўляюць Новікаву ў райвыканкоме.

Ну, а як з кватэрай?

Адносна гэтага тав. Новікаў чуе заўсёды адзін і той-жа адказ у РВК і РК:

— Ну, дзе мы табе можам узяць кватэру? Ведаеш-жа нашы багушэўскія ўмовы...

Вядома, што Новікаў і многія ў Багушэўску ведаюць кватэрныя ўмовы. Вядома, напрыклад, што знойдзена добрая прасторная кватэра культпропу РК ЛКСМ Грэйзбергу, які не захапеў жыць у старой кватэры, замяніў кватэру раённаму пракурору, знойдзены кватэры і для тахнічных работнікаў РВК... Другі сакратар РК КП(б)Б Масалкоў жыве не ў дрэннай кватэры, але яму абсталёўваецца новая — хутка пяройдзе. А вось загадчыку райана, Новікаву, таму самаму Новікаву, якога вылучылі ўсяго пяць месяцаў таму назад на кіруючую работу ў раён, ніяк нельга знайсці ў Багушэўску кватэру.

Каб не сям'я, каб не двое малых дзяцей, Новікаў выкінуў-бы з галавы думкі аб кватэры. Сам звыкся ўжо начаваць дзе папала. Але-ж сям'я цягне да сябе, хочацца часцей бачыць пасцігадовую дачку і дзесяцімесячнага сына. А за 23 кілометры звычайна не так часта можаш бачыць сям'ю.

А сям'я вельмі трывожыць тав. Новікава. У канцы студзеня і жонка і дзеці захварэлі на грып. Пасля гэтага ва ўсіх ускладненне. Дзеці захварэлі на запаленне лёгкіх і запаленне жалёз, а жонка атрымала востры рэўматызм і ўскладненне на сэрцы. Патрэбна была канкрэтная дапамога яго жонцы—настаўніцы Новікавай Сцепанідзе. У першую чаргу патрэбна была ўрачэбная дапамога.

І вось тут якраз горш за ўсё былі праяўлены да Новікавых бяздушныя начальчэчыя адносіны. Новікава і яе дзеці ляжалі ў халоднай кватэры ў Машканах доўгі час без медыцынскай дапамогі. Раённы ўрач адмаўляўся ехаць так далёка да хворых.

Тав. Новікаў знаходзіўся ў роспачы, пайшоў у райком партыі за дапамогай.

— Адпусціце мяне на некалькі дзён з'ездзіць у Вішебск устроіць жонку ў больніцу.

— Не можам, ты павінен паехаць у калгасы для праверкі, як выконваецца статут сельгасарцелі, — адказаў другі сакратар РК Масалкоў.

— Дык што-ж мне рабіць? Жонка-ж вельмі дрэнна адчувае сябе.. Я не магу паехаць па калгасах,— прасіўся Новікаў.

Сакратар РК Масалкоў грозна крыкнуў:

— Папрабуй не паехаць, куды цябе пасылаем, адразу выключым з партыі!

І Новікаў паехаў у калгасы па заданню райкома партыі. А жонка напісала ў райздраў, каб выслалі ёй урача. Але райздраў заставаўся глухім да таго часу, пакуль не ўмяшаўся Наркомасветы. І вось у пачатку мая раённы ўрач наведаў, нарэшце, хворую настаўніцу.

Настаўніца Новікава Сцепаніда і зараз ляжыць у пасцелі, хварэе рэўматызмам і сардэчнай хваробай, не атрымліваючы належнай сістэматычнай медыцынскай дапамогі.

Страціў усякую надзею Новікаў на атрыманне ў Багушэўску кватэры і перавезці сям'ю.

Не, нельга так адносіцца да работнікаў, да культурных работнікаў, да людзей, як адносяцца ў Багушэўску.

С. СЯМАШКА.

ПАРАХОД „СУЧАН" ВЯРНУЎСЯ НА РАДЗІМУ

Ва Владзівастокскі порт вярнуўся затрыманы два месяцы назад у японскім порце Аоморы совецкі параход «Сучан». Капітан гэтага судна (як і капітан вызваленага японскімі ўладамі ў канцы красавіка другога затрыманага ў Аоморы совецкага парахода «Двина») безгрунтоўна абвінавачваўся ў незаконным заходзе ў закрыты порт.

У тэлеграме на імя наркома воднага транспарту тав. Н. І. Пахэмава экіпаж «Сучана», які вярнуўся на радзіму, адзначае, што «за двухмесячнае прабыванне ў японскім порце, не гледзячы на многія спробы японскіх улад, совецкія маракі не далі нічым сябе справакаваць. Усе работнікі «Сучана» — ад камандзіра да прыбральшчыка — аказаліся дастойнымі сынамі вялікай радзімы».

Маракі перадаюць ураду, роднай партыі і любімаму Сталіну большэвіцкае дзякуй за клопаты аб іх і іх сем'ях.

ВЯЛІКАЯ ЦІКАВАСЦЬ У АНГЛІІ ДА ПРАЕКТУ КАНСТЫТУЦЫІ СССР

ЛОНДАН, 18 мая. (БЕЛТА). Паведамленне аб тым, што пленум канстытуцыйнай камісіі ЦВК СССР пад старшынствам таварыша Сталіна ўстанавіў канчатковы тэкст праекту канстытуцыі СССР, апублікавана ў большасці газет і выклікала вялікую цікавасць у Англіі. Учора ўвечары брытанская радыёвяшчальная кампанія перадавала гэта паведамленне па радыё.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

* Асацыяцыя шахцёраў Шатландыі (Англія) ад імя 130 тысяч гарнякоў звярнулася да германскага ўрада **з патрабаваннем вызвалення Тэльмана і іншых палітзняволеных.**

* Скончыўся антывоенны **кангрэс моладзі** штата Нью-Іорка (ЗША). У кангрэсе прымала ўдзел 661 дэлегат, якія прадстаўляюць 300 тысяч чал. Кангрэс прыняў рэзалюцыю, якая заклікае моладзь змагацца супроць падрыхтоўкі ЗША да вайны.

* Студэнты чатырох вышэйшых навучальных устаноў у Львове (Польшча) абвясцілі **забастоўку пратэсту** супроць вельмі высокай платы за навучанне.

* Ва ўніверсітэтах Германіі ўведзен новы прадмет — **«навука аб калоніях».** У Неерзене (Рэйнская вобласць) арганізаван спецыяльны тэхнікум па каланіяльных праблемах. Выпускнікі тэхнікума будуць адпраўлены ў былыя германскія калоніі ў якасці «носьбітаў каланіяльнай місіі».

* Прафесар Пікар, — вядомы бельгійскі вучоны, які намерваўся за 20 тысяч фунтаў стэрлінгаў узяць з сабой аднаго пасажыра ў палёт у стратасферу, — атрымаў 20 заяў ад асоб, якія жадаюць прыняць удзел у палёце.

* Рэдактар фашысцкай газеты «Аксіён франсез» французскі манархіст **Шарль Морас,** прыгавораны ўжо да 4-х месяцаў турмы за заклікі ў друку да палітычных забойстваў, зноў прыцягнут пракуратурай да адказнасці за артыкулы, накіраваныя супроць кіраўніка соцыялістычнай партыі Леона Блюма.

* Італьянскімі ваеннымі ўладамі ў Абісініі **высланы з Адыс-Абебы** чакалькі карэспандэнтаў «па падазронасці ў шпіянажы». Сярод высланых карэспандэнты лонданскай газеты «Таймс», «Нью-Іорк Таймс», агенцтва Херста і інш.

ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ НОВЫМ ПОЛЬСКІМ УРАДЗЕ

ПАРЫЖ, 17 мая. Характар урадавых перамен у Польшчы не выклікае тут ні ў кога сумнення.

Газеты «Тан», «Эко дэ Пары» «Эвр», «Папюлер» сходзяцца на тым, што польскі ўрадавы крызіс прыйшоў нарэшце да рэзультатаў, апракінуўшых усе меркаванні. Склад новага габінета азначае адмаўленне ад усялякіх, нават ублюдачных, уступак грамадскай думцы краіны і дазваляе прадказваць бязлітасныя ўрадавыя рэпрэсіі ў адказ на малейшае праяўленне апазіцыі. У галіне знешняй палітыкі новы габінет, па думцы гэтых газет, будзе поўнасцю падтрымліваць германафільскую палітыку міністра Бека.

Пертынакс у «Эко дэ Пары» ўказвае, што Славой-Складкоўскі, Грабоўскі і іншыя міністры справяцца з задачамі ўнутранай палітыкі не ў большай меры, чым іх папярэднікі. Эканамічны крызіс па-ранейшаму лютуе ў Польшчы. Асабліва цяжкае становішча сялянства, якое, як адзначае Пертынакс, пачынае выходзіць са становішча пасіўнасці.

***

ВАРШАВА, 18 мая. (БЕЛТА). Характарызуючы новага прэм'ер-генерала Славой-Складкоўскага, газета «Наш пшэглёнд» піша:

«На палітычнай арэне з'явіўся чалавек, які ўсё сваё жыццё імкнуўся быць ценем Бельведэра (былая рэзідэнцыя Пілсудскага), водгуллем слоў правадыра, без пярачання паслухмяным выканаўцам. Цяпер ён стаіць на-выпяжку ў чаканні загадаў генеральнага інспектара арміі. Учора ён граміў ворага ўнутрыўрадавага лагера. Сёння ён павінен згуртаваць гэты лагер. На месца ўрада штацкіх і ваенных урад ваеннага ўзору з дзвістам беспярэчнай паслухмянасці, з вачыма, утаропленымі ў генеральнага інспектара. Гэту каманду вядзе заўсёды паслухмяны, рашучы і прамалінейны генерал Славой-Складкоўскі, які застаўся тым-жа, якім ён быў, калі па загаду правадыра ўводзіў у 1928 годзе ў будынак сейма атрад салдат. Замест доўгіх прамоў, пойдуць загады...»

***

ВАРШАВА, 18 мая. (БЕЛТА). Газета «Гонец варшавскі» паведамляе, што ў бліжэйшыя дні будзе выдана распараджэнне прэзідэнта рэспублікі аб скліканні 26 мая надзвычайнай сесіі польскага сейма. Згодна вестак газеты, гэта сесія павінна будзе зацвердзіць дэкрэт аб асобых пэўнамоцтвах урада.

Перакідванне японскіх войск у Паўночны Кітай

ТОКІО, 17 мая. Па паведамленню байпінскага карэспандэнта агенцтва «Домей Цусін», 16 мая ў Бэйпін прыбыў новы атрад японскіх войск пад камандаваннем генерал-маёра Кавабэ.

***

НЬЮ-ІОРК, 16 мая. Агенцтва «Асашыэйтэд прэс» паведамляе з Бэйпіна, што дыпламатычныя прадстаўнікі ЗША і іншых краін заняты вывучэннем таго сур'ёзнага становішча, якое стварылася ў рэзультаце павелічэння японскіх гарнізонаў у Паўночным Кітаі.

Па словах агенцтва, па баксерскаму пратаколу (1901 г.) Японія і іншыя ўдзельнікі пратакола маюць права пасылаць у Кітай толькі ўзброеныя сілы для зхоўв сваіх прадстаўніцтваў. Японія, прадаўжае агенцтва, мае ў сучасны момант у Паўночным Кітаі войск у колькасці амаль у 10 тысяч чалавек; гэтых войск дастаткова для заняцця аэрадромаў і чыгуначных станцый у стратэгічна важных пунктах.

У кітайскіх колах, піша далей агенцтва, указваюць, што павелічэнне колькасці японскіх войск ажыццяўляецца з мэтай падрыхтаваць захват Паўночнага Кітая, а таксама ў выглядзе падрыхтоўкі на выпадак вайны з Совецкім Саюзам.

У некаторых дыпламатычных колах падкрэсліваюць, што кітайскаму ўраду непадсілу абараніць Паўночны Кітай ад японскай агрэсіі.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ І РАССТРЭЛЫ У АДЫС-АБЕБЕ

ЛОНДАН, 18 мая. (БЕЛТА). Газета «Таймс» паведамляе, што з 5 мая, калі італьянскія войскі заняілі Адыс-Абебу, італьянскімі ўладамі ў Адыс-Абебе было арыштавана звыш 1.500 чалавек. У Адыс-Абебе ваенны трыбунал выносіць масавыя смяротныя прыгаворы. Прыгавораных расстрэльваюць групамі па 40—50 чалавек.

У знак пратэсту супроць невыканання сенатам штата Нью-Джэрсі (ЗША) высунутых беспрацоўнымі патрабаванняў група беспрацоўных размясцілася ў будынку сената, адмаўляючыся пакінуць яго да выканання іх патрабаванняў. НА ЗДЫМКУ: група беспрацоўных, якія начуюць у парламенце.

(Саюзфото).

СОЦЫЯЛІЗМ, ЗНІШЧЭННЕ КЛАСАЎ І РОСКВІТ СОВЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ

Совецкая краіна пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна завяршае пабудову бяскласавага соцыялістычнага грамадства. У двух дакументах: гутарцы таварыша Сталіна з панам Рой Говардам і гутарцы тав. Молатава з панам Шастэнэ — у яркіх, простых і дакладных фармулёўках адбіта новае ў нашай краіне — новыя задачы і перспектывы, звязаныя з дасягнутымі сусветна-гістарычнымі перамогамі соцыялізма і намечанымі зменамі ў Совецкай канстытуцыі.

У СССР закончан працэс ліквідацыі эксплаататарскіх класаў. Ужо ліквідован самы шматлікі, яшчэ ў нядаўнім мінулым глыбока каранёўшыйся ў эканоміцы дробнатаварный вытворчасці апошні капіталістычны клас — кулацтва: «У нас не засталося ні ў адной галіне гаспадаркі капіталістаў, не засталося і капіталісткаў» **(Молатаў).**

Калгасны лад перамог канчаткова. Знішчаецца векавая пропілегласць паміж горадам і вёскай. Калгасы пад кіраўніцтвам партыі і совецкай дзяржавы ўмацаваліся, напоўніліся сапраўды соцыялістычным зместам і арабілі ўжо першыя знатныя кроўі па шляху заможнага і культурнага жыцця. Застаўшыеся аднаасобнікі, якія складаюць не больш 10 проц. сялянскіх гаспадарак, быстра ўцягваюцца ў калгасы. Калектывізацыя совецкай вёскі ідзе да свайго канчатковага завяршэння.

Грамадская, соцыялістычная ўласнасць становіцца адзінай формай уласнасці на сродкі вытворчасці ў нашай краіне.

Але трэба ясна разумець, што існуюць дзве формы грамадскай, соцыялістычнай уласнасці: «дзяржаўная, гэта значыць усенародная, а таксама каапераціўна-калгасная ўласнасць» **(Сталін).**

Розніца паміж гэтымі рознавіднасцямі соцыялістычнай уласнасці заключаецца ў тым, што калі ў дзяржаўных прадпрыемствах (у тым ліку ў соўгасах і МТС), якія з'яўляюцца прадпрыемствамі паслядоўна-соцыялістычнага тыпу, поўным гаспадаром з'яўляецца дзяржава, то ў калгасах аграмаджаныя сродкі вытворчасці і прадукцыя належыць калгасам, і калгаснікі з'яўляюцца іх поўнымі гаспадарамі.

Калгасы ўзніклі ва ўмовах дыктатуры пролетарыята і развіваюцца пад арганізацыйным і палітычным кіраўніцтвам совецкай дзяржавы, працуюць па зацверджаных дзяржавай планах. Дзяржаве належыць зямля, якая замацавана на вечнае карыстанне за калгасамі. Дзяржаве належаць сельскагаспадарчыя машыны, якія паступаюць у распараджэнне МТС, з'яўляючыхся дзяржаўнымі прадпрыемствамі паслядоўна-соцыялістычнага тыпу. З ростам ролі МТС, якія ўжо ў сучасны момант ахапляюць вялікую частку калгасаў, расце і ўдзельная вага дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Усё больш расце дапамога, аказваемая дзяржавай калгасам.

Увесь лад калгаснага жыцця склаўся пад кіраўніцтвам партыі і совецкай дзяржавы як лад соцыялістычны. Калгасная вытворчасць аднатыпная з соцыялістычнай вытворчасцю. Гэтаму не перашкаджае наяўнасць у сельскагаспадарчых арцелях асабістай падсобнай гаспадаркі калгасніка. Асабістая падсобная гаспадарка ў асноўным з'яўляецца гаспадаркай спажывецкай і толькі часткова—таварнай. У тых межах, у якіх асабістая дадатковая гаспадарка дапушчана сталінскім статутам сельскагаспадарчай арцелі, яна не толькі не перашкаджае справе соцыялістычнага перавыхавання калгаснікаў, умацаванню і росквіту соцыялістычнай вытворчасці, а, наадварот, дапамагае ёй, забяспечваючы правільнае спалучэнне асабістых інтарэсаў калгаснікаў з грамадскімі інтарэсамі.

У СССР знішчана бяздонне, якім капіталізм раздзяліў горад і вёску. У вёсны развіваецца буйная машынная вытворчасць; ў ёй ужо выраслі і прадаўжаюць расці новыя кваліфікаваныя кадры работнікаў, кадры арганізатараў буйнай, аграмаджанай сельскай гаспадаркі. Па тэмпах свайго развіцця соцыялістычная сельская гаспадарка даганяе нашу прамысловасць.

«Мы хочам жыць, як жывуць у Маскве», — заявілі стаханоўцы-камбайнеры на сваёй усесаюзнай нарадзе з членамі ЦК ВКП(б) і ўрада. І гэты голас людзей сталінскай эпохі, у якіх словы не разыходзяцца са справай, лепш за ўсё характарызуе гігантскі рост культурных запросаў вясковага насельніцтва, яшчэ нядаўна забітага і адсталага. Размах культурнай рэвалюцыі ў калгаснай вёсцы велізарны, але гэта не значыць, што адсталасць вёскі ўжо канчаткова пераможана.

Наша краіна ўжо даўно ўступіла ў перыяд соцыялізму. Абсалютная перавага соцыялістычных элементаў у нашай народнай гаспадарцы азначала ўступленне ў перыяд соцыялізма, аб чым гаварыў таварыш Сталін яшчэ на XVI з'ездзе партыі.

Поспехі ў выкананні народнагаспадарчага плана 1935 года дазволілі тав. Молатаву заявіць на апошняй сесіі ЦВК СССР, што народная гаспадарка нашай краіны «стала поўнасцю **соцыялістычнай** гаспадаркай».

Новае ў нашай краіне, дасягнутае паспяховым выкананнем асноўнай палітычнай задачы другой пяцігодкі, дасканала ахарактарызавана ў гутарцы таварыша Сталіна з панам Рой Говардам і ў гутарцы тав. Молатава з панам Шастэнэ. «Наша грамадства, — гаварыў таварыш Сталін, — складаецца выключна з свабодных тружанікаў горада і вёскі — рабочых, сялян і інтэлігенцыі». Паміж рознымі праслойкамі соцыялістычнага грамадства «застаецца толькі некаторая, але не карэнная розніца» **(Сталін).**

Паміж гэтымі праслойкамі няма класавых супярэчнасцей, хоць кожная з іх можа мець свае спецыяльныя інтарэсы.

У нашай краіне яшчэ ёсць нерэзыткі капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей. Самая розніца паміж грамадскімі праслойкамі: рабочымі, служачымі, інтэлігенцыяй, калгаснікамі — унаследавана ад ранейшага класавага падзелу. У будучым комуністычным грамадстве, які канчаткова сатрэцца розніца паміж горадам і вёскай, калі знішчыцца процілегласць паміж разумовай і фізічнай працай, калі поўнасцю, будзе пераможан унаследаваны ад мінулага падзел працы, — сатрэцца і тая розніца паміж асобнымі праслойкамі грамадства, якая захоўваецца ва ўмовах соцыялізма.

Але ўжо зараз адносіны паміж гэтымі праслойкамі будуюцца на новых пачатках. У гэтых адносінах яшчэ больш чым раней пераважае адзінства, заснаванае на агульных інтарэсах, на ўсеагульнай зацікаўленасці і быстрым руху наперад па шляху соцыялізма. «Супярэчнасці» паміж гэтымі праслойкамі носяць прыватны, падначалены характар. Авангардная роля пролетарыяту, вынікаючая з усёй гісторыі барацьбы за соцыялізм, захоўваецца ў бяскласавым, соцыялістычным грамадстве, але праяўляецца па-новаму.

Народы Совецкага Саюза, якія падышлі ўшчыльную да соцыялістычнага, бяскласавага грамадства, пачынаюць па-новаму адчуваць сваё песнае адзінства. Самае слова «народ» напоўнілася новым зместам. У мінулым народ быў падзелен на антаганістычныя класы, інтарэсы якіх былі непрымірымы. Пануючыя эксплаататарскія класы і іх партыі прыкрывалі фразамі аб народных інтарэсах свае ўласныя класавыя мэты і задачы. Вось чаму большэвікі заўсёды адносіліся падазрона да дэкламацый аб «народзе» і яго «інтарэсах», выкрывалі класавую прыроду гэтай балбатні, выкрывалі інтарэсы кіруючых класаў.

Але цяпер інтарэсы ўсяго совецкага народу па ўсіх карэнных пытаннях эканомікі і палітыкі адзіны. Соцыялістычны народ у цэлым і кожная з яго праслоек зацікаўлены ў быстрым росквіце соцыялістычнай гаспадаркі і культуры, ва ўмацаванні абароназдольнасці соцыялістычнай радзімы. І гэта рэальнае адзінства інтарэсаў з'яўляецца зарукай найвялікшай сілы і магутнасці нашай краіны. Выдатным накавальнікам гэтага адзінства служыць тое захапленне, з якім совецкія людзі называюць правадыра партыі і рабочага класа Леніна і Сталіна правадыром народаў СССР.

Працоўныя розных нацыянальнасцей Совецкага Саюза складаюць адзіную соцыялістычную сям'ю народаў, не раздзіраемых класавымі супярэчнасцямі, ідучых прамой дарогай да ўздыму гаспадаркі і культуры, да замо'кнага, шчаслівага жыцця. Вось чаму так расцвіла ў народных масах любоў і адданасць да соцыялістычнай радзімы, набываючы глыбіню і сілу, зусім непараўнальную з «патрыятызмам» у буржуазных, класавых дзяржавах. Ніколі ні адзін народ не любіў сваёй радзімы так, як любяць яе совецкія людзі, совецкая моладзь, перад якою адкрыты шляхі шчаслівага жыцця!

У капіталістычным свеце «радзіма» — злая мачыха для працоўных. У краінах капіталізма багацці, створаныя працай рабочых і сялян, не належаць народу, а з'яўляюцца ўласнасцю кучкі капіталістаў.

У Совецкім Саюзе ўсе багацці належаць працоўнаму народу і выкарыстоўваюцца ў мэтах далейшага ўзняцця ўзроўню жыцця народных мас. Няхай памятаюць аб гэтым арганізатары вайны супроць Совецкага Саюза. Няхай яны памятаюць аб тым, што ў Совецкім Саюзе індустрыяльная магутнасць і баявыя сілы Чырвонай арміі памнажаюцца гераічным духам совецкіх народаў і іх адданасцю соцыялістычнай радзіме!

Пабудова бяскласавага, соцыялістычнага грамадства, ліквідацыя капіталістаў і капіталісткаў яшчэ не азначае, вядома, што ў нашай краіне ўжо няма варожых соцыялізму элементаў.

«Іх яшчэ засталося не мала, — гаварыў тав. Молатаў на 2-й сесіі ЦВК СССР 10 студзеня 1936 года. — І малейшае аслабленне рэвалюцыйнай пільнасці яны выкарыстоўваюць, каб шкодзіць і кідаць нам палкі ў калёсы. Нельга таксама забываць аб тым, што дробнабуржуазная стыхія, жывучая, што нават сярод працоўных сялян-калгаснікаў, у масе служачых нашага дзяржапарата, а часамі і сярод рабочых, яны лёгка знаходзяць сваіх выражальнікаў, то ў выглядзе бюнага роду спекулянцікаў, то ў выглядзе рвачоў у адносінах калгаснага і дзяржаўнага дабра, то ў выглядзе антысовецкіх паклёпнікаў і т. д.».

Класавая барацьба ў нашай краіне яшчэ не скончана. Барацьба з перажыткамі капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей ёсць своеасаблівая форма класавай барацьбы, патрабуючая ад совецкіх людзей вытрыманасці, стойкасці, пільнасці.

Новая канстытуцыя Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, выпрацоўваемая па рашэнню VII з'езда советаў камісіяй пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, з'яўляецца **Канстытуцыяй соцыялістычнай дзяржавы.** Толькі пры соцыялізме магчыма такое поўнае разгортванне совецкай, соцыялістычнай дэмакратыі, якое прадугледжана ў рашэннях VII з'езда советаў.

Таварыш Сталін у гутарцы з панам Рой Говардам указаў: «Як ужо было абвешчана, па новай канстытуцыі выбары будуць усеагульнымі, роўнымі, прамымі і тайнымі... Усе грамадзяне, за выключэннем пазбаўленых выбарчых праў па суду, будуць мець права выбірацьі быць выбранымі».

Совецкая дэмакратыя з'яўляецца новым, больш высокім тыпам дэмакратыі — соцыялістычнай дэмакратыяй, якой няма і не можа быць ні ў адной капіталістычнай краіне.

Таварыш Сталін, адказваючы на пытанне пана Рой Говарда аб партыях, аб выбарчай барацьбе, даў геніяльна простае, вычэрпальнае тлумачэнне новага зместу совецкага дэмакратызма.

Буржуазным палітычным дзеячам здаецца, што выбарчая барацьба скрозь і ўсюды павінна быць барацьбой паміж палітычнымі партыямі. Яны прывыклі бачыць у сістэме дэмакратычных выбараў жорсткую барацьбу розных партый за месца ў парламенце, за ўдзел ва ўрадзе і т. д. Нават здаецца, што ў гэтай барацьбе партый, у наяўнасці кіруючай партыі і апазіцыі заключаецца сутнасць парламенцкай дэмакратыі. Але ў нашай краіне няма іншых партый, апрача партыі комуністаў, арганізаваўшай пабудову соцыялізма і карыстаючайся

ЗЛАЧЫНЦЫ НЕ ПАКАРАНЫ

(ПІСЬМО СТАРШЫНІ РЭЎКАМІСІІ)

Рэвізіяй па калгасу **«Большэвік»**, Амельянаўскага сельсовета, **Смалявіцкага раёна**, выяўлена, што старшыня калгаса **Гараўскі** растраціў 900 руб., работай не цікавіўся. МТФ прыведзена да развалу. Згноена 400 пудоў бульбы і 300 пудоў вікі. За крамніка Зуеўскага заложана за растрату 1 400 руб. калгасных грошай.

Рахункавод калгаса **Шымановіч** Адам разам з праўленнем пакрываў злачынствы і запалохваў калгаснікаў, якія ўказвалі на недахопы ў рабоце.

Аб усім гэтым быў перадан матэрыял смалявіцкаму пракурору. Але пракурор чамусьці спыніў справу.

ДАЎГІЛЕВІЧ.

НЕ ВЕРАЦЬ ДАКУМЕНТАМ

(ПІСЬМО ЧЛЕНАЎ ГОРСОВЕТА)

Мы, як члены горсовета, атрымалі з Менгорсовета даручэнне — агледзець санітарнае становішча кіно і тэатраў горада.

Калі мы прышлі ў кіно «Пролетарый», то дырэктар кіно, паглядзеўшы дакумент, не пусціў нас у памяшканне.

— Гэта не дакумент, — гаворыць ён, — пакажыце які-небудзь другі, тады дазволю аглядаць.

Колькі мы яго не пераконвалі, што з гэтым дакументам намі ўжо агледжаны ўсе кіно, — нічога не дапамагло.

Як відаць, для агляду санітарнага становішча кіно «Пролетарый» дакументы горсовета не з'яўляюцца сапраўднымі.

ОРМАН, БАРЫСЕВІЧ.

СПРАВА ДОБРАЯ, АЛЕ...

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

У раённым цэнтры Журавічах вырашылі на месцы базара пабудаваць сквер, а базар перанесці на іншае месца.

Справа добрая, але толькі метад рэканструкцыі раённымі арганізацыямі быў выбран няправільны. Не забяспечыўшы райсаюз і райзаг новымі крамамі, аддзел комунальнай гаспадаркі разбурыў усе старыя крамы на базары. Райсаюз і райзаг вымушаны былі вывезці ўсе свае тавары і скласці іх у былым свінарніку.

У выніку зараз гандаль і загатоўкі ў мястэчку спыніліся.

Вось як журавіцкія арганізацыі «садзейнічаюць» кааперацыі.

ФРЫДМАН.

КАРОТКІЯ СІГНАЛЫ

ТРЫ МЕСЯЦЫ Ў РАМОНЦЕ

У магілеўскі аўтарамонтны завод імя Кірава соўгас «Калязінка» (Прапойскі раён) яшчэ ў сакавіку здаў у рамонт матор ад аўтамашыны. Матор да гэтага часу не адрамантаваны, і соўгас не мае магчымасці ў дастатковай колькасці дастаўляць гаручае для трактараў.

КЛІМЕНКА.

НЯМА ЎЧОТУ

У калгасе «Высокае» (Коханаўскі сельсавет, Талачынскага раёна) заблытан учот працадзён. Прапоўныя кніжкі на 1936 год калгаснікам не выданы.

ШАПАВАЛАЎ і іншыя.
(5 подпісаў).

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

«ОЧКАЎЦІРАЦЕЛЬСТВА»

Пад такім загалоўкам у «Звязде» было змешчана пісьмо, што па Барысаўскаму раёну цекатроўцы хлебныя склады авансам выпісвалі квітанцыі на хлебазакупкі.

З канторы Саюзхлебгандля паведамілі нам, што адзначаныя факты поўнасцю пацвярджаюцца. Вінаваты — загадчык крамы № 11 (леспрамгаса) Сацук зараз арыштаваны. Справа аб іншых вінаватых перадана судовым органам для прыцягнення да адказнасці.

ТРЫБУНА СТАХАНАЎЦА

МАЛЕНЬКАЯ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ І ВЯЛІКІ ЭФЕКТ

40 год працую я цесляром на пабудовах.

Цяпер я працую апалубшчыкам Вялікага дзяржаўнага тэатра БССР. Сапраўднае жыццё для мяне па сутнасці толькі пачалося, я адчуваю сябе нібы памаладзеўшым.

Стахановскі рух унёс многа новага ў будаўнічыя работы. Апалубка, якая раней рабілася выключна ўручную, цяпер робіцца механізавана. Праўда, механізацыя вельмі прымітыўная, нескладаная, але эфект вялікі.

У чым сутнасць апалубачнага «варштата»? Два звычайныя шчыты шырынёй у 90 сантыметраў. Яны ляжаць паралельна на аддлегласці ў паўтара метра. На козліках, паверх гэтых шчытоў, набіты брускі, якія вызначаюць аддлегласць паміж планкамі выраблямага шчыта. Тут-жа змешчаны рычажныя зжымы, якія зажымаюць шчыльна шчыт. Пад планкамі шчыта ляжаць жалезныя поласы, дзякуючы якім цвікі, забіваемыя ў шчыт, самі загінаюцца. Вось і ўсё. Зрабіць такі варштат—справа зусім невялікая. У нас на пабудове Вялікага дзяржаўнага тэатра варштат зроблен па ініцыятыве прараба першага ўчастка сакратара комсамольскага камітэта тав. **Расіна.**

Што мы атрымалі ад гэтай рацыяналізацыі? Раней, калі апалубка рабілася ўручную, кожны з нас за змену даваў не больш 40—45 кв. метраў апалубкі. А цяпер пры дапамозе варштата мы робім 150—175 метраў (наша новая норма 70 кв. метраў). Цяпер мы ўдвох (я і апалубшчык т. Маркевіч) забяспечваем апалубкамі ўсю будоўлю. Тое, што гэта работа сканцэнтравана ў адным месцы, дае вялікую эканомію рабочай сілы. Раней кожны, каму патрэбен быў шчыт, сам рабіў яго, траціў шмат часу на пошукі матэрыялаў і т. д. Цяпер гэта лішняя трата часу непатрэбна.

Я лічу, што гэты вопыт неабходна перанесці і на іншыя пабудовы, бо чым больш мы механізуем будаўніцтва, тым таней яно абыходзіцца і хутчэй выконваецца.

Трэба адзначыць адзін недахоп, які перашкаджае нашай працы, гэта дрэнная распілоўка дошак на лесазаводзе Белбудпрамтрэста. Распілоўка неахайная, крывая. Калі зжымаеш даве дошкі, то яны шчыльна не прылягаюць адна к другой. Прыходзіцца дадаткова часаць дошкі, што адбірае нямала часу. Між тым, лесазавод, пры больш уважлівых адносінах да якасці прадукцыі можа даць добрыя, роўныя дошкі.

Г. А. МАЛАФЕЕЎ,
стахановец-апалубшчык пабудовы Вялікага дзяржаўнага тэатра.

ПРЫЧЫНЫ, ЗНІЖАЮЧЫЯ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ

Установленыя новыя нормы кладкі цэглы я перавыконваю. Норма — 1015 цаглін, а я кладу 2 тысячы. Але і гэта не грань. Можна даць яшчэ больш, калі-б нам былі створаны нармальныя ўмовы работы.

Я працую з падсобным. Ён падае мне цэглу і раствор, а я укладваю. Але атрымліваецца так, што кожны дзень мяняюцца падсобныя. Не паспееш прывыкнуць, зладзіцца з чалавекам, а ўжо даюць другога. Пачынаецца гісторыя спачатку. Гэта безумоўна адбіваецца на прадукцыйнасці.

Але мала гэтага. Тармозіць яшчэ дрэнная работа механізмаў. Падъёмнікі часта псуюцца. У разультаце — перабоі з дастаўкай цэглы і раствору. Вось 15 мая перастаў працаваць адзін падъёмнік, які падае цэглу. Спыніла работу і бетонамяшалка. У гэты дзень фактычна я больш стаяў, чым працаваў. 16 мая гісторыя паўтарылася, не паспявалі падаваць раствор. Зноў былі прастоі. А 17 мая, каб не было перабояў у забеспячэнні нас растворам, кіраўніцтва будаўніцтва (прараб Александровіч) знайшло «выхад» —перакінула нашых падсобных рабочых на падноску раствору ўручную (на трэці паверх), бо пушчаны ў ход падъёмнік аказаўся няспраўным.

Гэтыя ненармальнасці і тармозяць работу не толькі маю, але і ўсіх каменшчыкаў пабудовы школы.

КУЧЫНСКІ Я. І.,
каменшчык пабудовы школы па Шырокай вуліцы, Менск.

ПАСЛЯ НАРАДЫ У КРЭМЛІ

ГОМЕЛЬ. (**Кар. «Звязды»**). Вярнулася з Масквы ўдзельніца ўсесаюзнай нарады жонак інжынерна-тэхнічных работнікаў — дэлегатка Гомсельмаша Спепаніла Пятроўна Аўцяронак. У гутарцы з нашым карэспандэнтам т. Аўцяронак падзялілася ўражаннямі і расказала аб прабыванні на нарадзе ў Маскве.

Нарада дала нам вялікую зарадку ў нашай вялікай рабоце. У нас на заводзе «Гомсельмаш» слаба разгорнут рух жонак інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Я асабіста бяру на сябе абавязацельства да кастрычніцкіх свят ліквідаваць непісьменнасць 10 чалавек. Зараз у нас пачынаецца падрыхтоўка да летніх піонерскіх лагераў і тут будзе шмат працы. Актыў, які зараз ёсць на заводзе, бярэцца сумесна з жонкамі стахановаў і рабочых разгарнуць работу на ўсіх участках.

За работу з новымі сіламі, з новай энергіяй!

ЦЁПЛАЯ СУСТРЭЧА

Учора ў Менску ў клубе металістаў адбылася цёплая сустрэча жонак гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і лепшых рабочых-стахановаў завода імя Варашылава з дэлегаткай усесаюзнай нарады тав. **Люскат.** На вечары прысутнічала дэлегатка ўсесаюзнай нарады жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода імя Кірава тав. **Урэцкая.**

Дэлегаткі расказалі аб рабоце ўсесаюзнай нарады, у якой актыўны ўдзел прымаў правадыр народаў родны Сталін.

Тт. Лоскат і Урэцкая перадалі вопыт работы жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў перадавых прадпрыемстваў Саюза. У сваіх выступленнях удзельніцы вечара—сустрэчы намецілі рад мерапрыемстваў па разгортванню руху жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў за культуру ў рабоце завода і быту рабочых.

У СОЎНАРКОМЕ БССР

Для падрыхтоўкі БССР да ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1937 года яшчэ ў лістападзе мінулага года створан рэспубліканскі камітэт пад старшынствам наркома земляробства тав. Бенека. Камітэтам складзен тэматычны план аддзела БССР на выстаўцы. Устаноўлена сувязь з раёнамі і 300 перадавымі калгасамі рэспублікі. Адбор экспанатаў на ўсесаюзную выстаўку мяркуецца рабіць на асенніх раённых сельскагаспадарчых выстаўках.

Па дакладу тав. Бенека Соўнарком БССР узняў хадайніцтва перад СНК Саюза аб выдзяленні на ўсесаюзнай выстаўцы спецыяльнага павільёна для размяшчэння экспанатаў БССР.

У склад рэспубліканскага камітэта замест раду выбыўшых членаў уведзены дадаткова тт. Сапрыцкі, Дзякаў, Бурачэўскі і Залескі.

***

На аснове пастановы ЦВК Саюза ССР, Соўнарком вынес рашэнне аб ліквідацыі беларускага аддзялення таварыства пролетарскага турызма і экскурсій (ОПТЭ). Арганізацыя і кіраўніцтва работай па правядзенню мясцовых і далёкіх экскурсій, масавага турызма і альпінізма перадана ЦСПСБ.

***

Згодна рашэння Соўнаркома раёнам Мазырскай акругі адпускаецца 50 тыс. рублёў крэдыту на будаўніцтва, цагельных, чарапічных і вапнавых заводаў у калгасах.

***

Соўнарком зацвердзіў каштарыс і план будаўніцтва 25-кватэрнага дома ў Полацку. Аб'ём дома вызначан у 12.072 кубаметры. На яго будаўніцтва будзе выдаткавана 664 тыс. рублёў.

(БЕЛТАЎ.

Словы і справы

На неаднаразовых нарадах і злётах рабселькораў, якія праводзіла хойніцкая раённая газета «**Ленінскі сцяг**», рэдактар гэтай газеты тав. **М. Пугач** вельмі прыгожа гаварыў аб шырокім прыцягненні да ўдзелу ў газеце рабселькораў, аб тым, што газету павінны рабіць масы, а не некалькі рэдакцыйных работнікаў.

Але словы — гэта адно, а практыка работы рэдакцыі хойніцкай газеты — другое. 16 красавіка толькі на адной паласе «Ленінскага сцяга» змешчаны тры матэрыялы рэдактара газеты — «Святы» забойца асуджан», «Не апраўдаўшы давер'я партыі» «Слова за пролетарскім судом». Прычым дзве заметкі падпісаны «**М. П.**», а трэцяя — «**П. Ч.**». Сельскораўскіх-жа заметак ва ўсім чатырохпалосным нумары газеты толькі тры.

Як відаць, у рэдакцыі хойніцкай газеты словы разыходзяцца са справай.

М. ЦІХАНЕНКА.

***

АД РЭДАКЦЫІ. Селькор Ціханенка зусім правільна ставіць пытанне аб вельмі нязначным скарыстанні селькораўскіх матэрыялаў на старонках хойніцкай газеты.

Мы прагледзелі нумары «Ленінскага сцяга» за другую палову красавіка і пачатак мая. У васьмі нумарах газеты, вышаўшых з 16 красавіка па 5 мая, змешчана не больш 20 селькораўскіх заметак. Дый то толькі нязначная частка гэтых матэрыялаў падпісана прозвішчамі аўтароў. Большасць заметак падпісана адной-двума літарамі — «Л», «Ш», «А. К.», «Т», а то і зусім нікім не падпісваюцца.

І здагадайся, хто хаваецца пад гэтымі таямнічымі «Л», «А.К» і т. д., ці селькор, ці работнік райгазеты! Такое становішча недапушчальна ў газеце, якая павінна быць цесна звязана з рабселькорамі, апірацца на іх у сваёй рабоце.

НА БАЯВЫХ ВУЧЭННЯХ У ЧЫРВОНАЙ АРМІІ



Танк бярэ перашкоду. Фото УМАНСКАГА (Саюзфото)

ЗА КУЛЬТУРНЫ СОВЕЦКІ ГАНДАЛЬ

АДОЗВА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ СТАХАНАЎЦАЎ ДЗЯРЖГАНДЛЮ ДА ЎСІХ РАБОТНІКАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА І КААПЕРАЦЫЙНАГА ГАНДЛЮ БССР

Дарагія таварышы!

Стахановы дзяржаўнага гандлю таксама як і стахановы прамысловасці, транспарту і сельскай гаспадаркі, паспяхова змагаюцца за паляпшэнне добрабыту працоўных нашай вялікай радзімы.

Пад кіраўніцтвам нашага любімага правадыра таварыша **Сталіна** наша выдатная краіна ідзе да сапраўднага багацця тавараў і прадуктаў, да далейшага росту спажывання, далейшага ўздыму матэрыяльнага добрабыту.

«Жыць стала лепш, таварышы. Жыць стала весялей. А калі весела жывецца, работа спорыцца». — Гэта вялікая сталінская праўда, аб жыцці совецкага народу ставіць велізарныя задачы перад кожным работнікам совецкага гандлю.

Павышэнне клопатаў аб людзях, усямернае задаваленне іх узрастаючых патрэб, сапраўднае культурнае абслугоўванне пакупніка і павага да яго ёсць велізарнейшая і ганаровейшая задача работнікаў совецкага гандлю.

Перамога генеральнай лініі нашай партыі дала магчымасць ужо ў 1935 г. ліквідаваць картачную сістэму, устанавіць адзіныя цэны на ўсе прамысловыя і харчовыя тавары, адмовіцца ад метадаў цэнтралізванага размеркавання. Усё гэта пры велізарнай перамозе нашага транспарту стварыла магутную базу хуткага і шырокага разгортвання тавараабароту.

Мы, удзельнікі ўсебеларускай нарады стахановаў дзяржаўнага гандлю Беларусі, шчаслівы адзначыць, што пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і СНК дзяржаўны гандаль Совецкай Беларусі да нашай нарады мае несумненныя поспехі.

Разгортваецца стахановскі рух. Усім нам ужо вядомы імёны такіх стахановаў дзяржгандлю, як т. Ліўшыц С. І. — прадаўшчыца Менхарчгандля, Кандрушкая М. прадаўшчыца менскай канторы Белпрамгандля, т. Круглікава — прадаўшчыца ГУМ'а, Гольдман Х. — прадаўшчыца Саюзхарчмага, Жураўскі — повар віцебскага рэстарана, Дахін С. — загадчык магазіна віцебскага аддзялення Белбаенгандля і многа іншых.

План рознічнага тавараабароту 1-га квартала ў размеры 218,5 мільёна рублёў па сістэме дзяржаўнага гандлю ў Беларусі выкананы на 101,2 проц.

Тавараабарот, у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года, узрос на 29,7 проц. Пераасталявана большасць магазінаў. У значнай меры спецыялізавана сетка і тым самым створаны адпаведныя ўмовы для культурнага абслугоўвання пакупнікоў. Сістэматычна павялічваецца асартымент тавараў у магазінах.

Але, не гледзячы на гэтыя дасягненні, да гэтага часу ў нашай рабоце ўсё яшчэ ёсць буйныя недахопы. Гандаль у БССР і зараз яшчэ адстае ад другіх галін народнай гаспадаркі.

Перад намі стаіць далейшая задача — бараньба за сапраўдны совецкі культурны гандаль.

Мы заклікаем работнікаў дзяржаўнага гандлю Беларусі выканаць гадавы план тавараабароту па гандлёвых арганізацыях сістэмы Наркомунтгандля БССР да 15 снежня 1936 года, перавыкананўшы гадавы план у сумарным выражэнні на 40 мільёнаў рублёў.

Нам неабходна дабіцца ў другім квартале, каб кожны магазін стаў рэнтабельным і даваў устаноўлены прыбытак. Змагаючыся за гэта, кожны работнік гандлю павінен з асаблівай сілай дапамагаць хутчэйшай і канчатковай ліквідацыі растрат — гэтай ганебнай плямы ў нашай рабоце.

Няўпныя эрухі ў якасным абслугоўванні спажыўца нас зараз не задавольваюць. Мы абавязаны ўсямерна палепшыць культурнае абслугоўванне пакупніка. Трымаць магазіны ва ўзорным стане. Устанавіць у магазінах добра прыбраныя вітрыны і культурна-арганізаваную рэкламу.

Максімальна ўкараніць у гандаль дастаўку тавараў на дом, інфармаваць пакупніка аб прыбываючых таварах.

Мы добра ведаем, што пакупніка не задавольвае толькі далікатныя адносіны прадаўца і акуратнасць магазіна. Пакупнік патрабуе, і мы абавязаны безумоўна забяспечыць устойлівасць асартыменту прадуктаў і тавараў у магазінах.

У нашай краіне людзі жадаюць добра і прыгожа апранацца, адсюль наша ганаровая задача — бесперапынна пашыраць асартымент, дабіцца, каб і прамысловасць выробляла тавар, патрэбны спажыўцу.

Неабходна таму арганізаваць сістэматычнае вывучэнне попыту і густу пакупніка.

У БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б выраслі і выхаваны новыя нацыянальныя кадры гандлёвых работнікаў — чэсныя і жадаючыя добра працаваць. Але мы значна адсталі ў аўладанні тэхнікай гандлёвай работы. Важнейшым звяном далейшага разгортвання стахановскага руху мы лічым усямернае набыццё работнікамі гандлю тэхнічных і агульных ведаў. Неабходна да канца гэтага года ахапіць усіх прадаўцоў, касіраў і дырэктароў магазінаў тэхнічным мінімумам. У гэтай справе асабліва важную ролю павінны адыграць профсаюзы, наробні з дырэктарамі гандлю і кантор.

Таварышы! Наша нарада ўскрыла шматлікія недахопы ў рабоце гандлёвых арганізацый, факты бюракратычнага скажэння стахановскага руху ў совецкім гандлі. Цяпер галоўная наша задача — неадкладна ліквідаваць выяўленыя недахопы, ахапіць усё больш і больш шырокія слаі работнікаў гандлёвага апарата стахановскім рухам. Ведучы няўхільную бараньбу за пераход на пастаянную стахановскую работу, неабходна рашуча выкарчоўваць усякага роду скажэнні ў стахановскім руху. Вялізнасна змагацца з сабатажнікамі і кансерватыўнымі элементамі, якія перашкаджаюць далейшаму разгортванню стахановскага руху сярод работнікаў гандлю.

Мы заклікаем стахановаў, а таксама ўсіх работнікаў спажывецкай кааперацыі, на падставе соцыялістычнага спаборніцтва, дабіцца ў гэтым стахановскім годзе карэннага паляпшэння ў абслугоўванні сельскага спажыўца.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і СНК БССР і іх ордэнаносных кіраўнікоў тт. Гікало і Галадзеда мы дабіліся ў 1936 годзе ўзорнай пастаноўкі ўсёй гандлёвай работы ў БССР. Мабілізуючы на паспяховае вырашэнне гэтай задачы ўсе свае сілы і здольнасці, мы заклікаем усіх работнікаў дзяржгандлю і кааперацыі шырэй разгарнуць стахановскі рух і на падставе яго ператварыць гандаль у перадавы ўчастак народнай гаспадаркі нашай квітнеючай ордэнаноснай рэспублікі.

Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва ў барацьбе за культурны совецкі гандаль, за выкананне ўскладзеных на нас партыяй і вялікім **Сталіным** ганаровых задач — чэсна і культурна гандляваць, поўнасцю задаволіць попыты совецкіх грамадзян.

Няхай жыве наш вялікі родны настаўнік і прыяцель народаў таварыш **Сталін**, які дае нам шчаслівае і заможнае жыццё!

ЯК ЗНІШЧАЦЬ ІЛЬНЯНУЮ БЛЫХУ

З многіх раёнаў (Менскага, Магілеўскага, Камарынскага, Заслаўскага) прыходзяць трывожныя весткі аб тым, што на ўсходах ільну ў вялікай колькасці з'явілася ільняная блыха.

Ільняная блыха — гэта вельмі дробны жучок сіняга або зялёнага колеру, у якога заднія ногі вельмі патоўшчаны. Жучкі зімуюць у глебе, у розным смецці і з'яўляюцца рана вясной, калі настае цёплае надвор'е. Пашкоджваюць жучкі лён выяданнем невялікіх язвачак на сцяблах, семядолях і маладых лістках усходаў ільну. У выніку вялікага пашкоджання, асабліва семядоляў, расліна звычайна засыхае. Разраджанасць пасеваў ільну і плешыны на ўчастках — гэта звычайныя вынікі пашкоджання блыхой. Блыха безумоўна можа прынесці страты, а пры непрыняцці своечасовых мер бараньбы можа знішчыць ураджай ільну. Таму неабходна ўсім гаспадаркам зараз-жа праверыць пасевы ільну і ў выпадку заўважання блыхі прыняць тэрміновыя меры бараньбы.

Знішчэнне блох можна правесці наступным чынам.

Вылаўліванне блошак блохалоўкамі. Блохалоўку можна зрабіць на працягу 15 мінут. Для гэтага бяруцца дзве дошкі шырынёй у 15 сантыметраў і даўжынёй у тры метры. Дошкі збіваюцца пад вуглом 80 градусаў і змазваюцца вугольнікамі. У крайнія вугольнікі ўбіваюцца цвікі шляпкамі наверх. Да цвікоў прывязваюцца вяроўкі такой даўжыні, каб рабочым было зручна насіць блохалоўку. Да задняй сценкі дошкі прымацоўваецца кавалак палатна не шырэй 15 см. У берагі яе, для таго, каб яна адвісала, зашываюцца лёгкія абрэзкі дрэва. Такая блохалоўка перасоўваецца рабочымі па ўчастку з такім разлікам, каб палотнішча датыкалася да раслін, і заганяла блох унутр блохалоўкі. Уся ўнутраная частка і пярэдняя дошка блохалоўкі змазваецца якім-небудзь клейкім вешчаством (маляс, дзёгаць, коламазь, адыходы смалы, алінафт і т. д.). Час ад часу неабходна блохалоўку ачышчаць ад наліпшых блох і падмазваць. Такой блохалоўкай два рабочыя за дзень могуць абыйсці 10 гектараў ільну і вылавіць да 60 проц блох, а пры паўторным праходжанні — 100 проц. Для блохалоўкі можна скарыстаць конныя граблі, адняўшы ад іх зуб'е, або пярэднюю вось з коламі ад звычайнай цялегі, прыбіўшы таксама дошку з палатном. Блохалоўкі, як правіла, павінны перасоўвацца наперадзе рабочых супроць сонца.

Апыльванне раслін атрутамі. а) Крэмнефторнатрам, з разліку 10 кілограмаў на гектар, з абавязковым дабаўленнем 10 кілограмаў дарожнага пылу. б) Мышяковакіслым кальцыем, з разліку 8 кілограмаў на гектар, з дабаўленнем 12 кілограмаў попелу або палёнай вапны. Пры адсутнасці вышэй указаных атрут можна рабіць апыльванне чыстай палёнай вапнай, попелам, табачным пылам, з разліку да 50 кілограмаў на 1 гектар. Апыльванне праводзіцца праз конныя апылвальнікі, раннавыя РВ-1, «Ціп-топ», а пры недахопе апаратуры — праз мяшкі з рэдкай тканіны.

БЕЗДЗЕНКА Т. Т.
Аддзел барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі НКЗБ.

ПАЛЯПШЭННЕ СЕНАЖАЦЕЙ І ВЫПАСАЎ

Яшчэ ў красавіку ў многіх раёнах рэспублікі пачаліся работы па раскарчоўцы, ачыстцы сенажацей і выпасаў ад хмызняку і па адводу вады. У 7 раёнах такія работы праведзены на плошчы ў 4.305 гектараў. У Полацкім раёне расчышчана ад хмызняку 250 гектараў сенажаці. У Бабруйскім асушана 500 гектараў сенажаці і на 946 гектарах зрэзана куп'е, ачышчан хмызняк і ўнесена ўгнаенне. 8 калгасаў Бешанковіцкага раёна пачалі пракопваць дзевяцікілометравы канал для адводу вады. Гэты канал ператворыць больш двух тысяч гектараў балота ў добрую сенажаць.

Сёлета па БССР асушка і карэнная паляпшэнне сенажацей і выпасаў будзе праведзена на плошчы 52 тыс. гектараў. Прасцейшыя палепшанні (расчыстка, зрэзванне куп'я, унясенне ўгнаенняў і інш.) праводзіцца на плошчы ў 328 тыс. гектараў.

бязмежным давер'ем усіх працоўных. Ворагі соцыялізма і рабочага класа спадзяюцца, што новы выбарчы закон абавязкова прывядзе да ўтварэння ў СССР палітычных партый і, значыць, да аслаблення ўплыву большэвіцкай партыі.

Дарэмны надзеі ворагаў. Блізарукі суджэнні буржуазных парламентарыяў! Яны не бачаць галоўнага і рашаючага: яны не разумеюць, ці не хочуць разумець розніцы паміж капіталістычным (класавым) і соцыялістычным бяскласавым грамадствам. Яны не бачаць ці не хочуць бачыць, што палітычная партыя ёсць частка пэўнага класа.

«Дзе няма некалькіх класаў, не можа быць некалькіх партый, бо партыя ёсць частка класа», — гаворыць таварыш Сталін. Гэтыя ясныя і простыя словы поўнасцю вычэрпваюць пытанне.

Буржуазія фашысцкіх краін таксама імкнецца ўвесці аднапартыйную сістэму. «Але з гэтай фашысцкай аднапартыйнай сістэмы нічога не выйдзе», — указвае таварыш Сталін. Увесці аднапартыйную сістэму ў класавым грамадстве — значыць папросту задушыць прыгнечаныя класы ў інтарэсах пануючага класа. Але нельга задушыць актыўнасць змагаючагася пролетарыята, не знішчыўшы фізічна самы пролетарыят.

У нас, СССР, няма глебы для стварэння змагаючыхся партый, бо няма класаў з іх процілеглымі інтарэсамі. Уплыў комуністычнай партыі ў нас таму бязмежны, што ўсе праслойкі совецкага грамадства рэальна зацікаўлены ў ажыццяўленні праграмы ВКП(б), у паступовым комунізме. Няма такой праслойкі сярод совецкіх людзей, інтарэсы якой патрабавалі-б звароту да капіталізма. Таму няма і сілы, якая адарвала-б совецкіх людзей ад ВКП(б) — гераічнага авангарда пролетарыяў, кіруючая роля якога заваявана і запісана гісторыяй найвялікшай з рэвалюцый.

Гэта зусім не значыць, што ў нас не будзе выбарчай барацьбы. Але ўся справа ў тым, што выбарчая барацьба будзе весціся на іншым, больш высокім узроўні. Соцыялістычны народ будзе выбіраць людзей, дастойных кіраваць краінай, вобласцю, горадам, раёнам, сялом. Ён будзе выбіраць лепшых і праганяць бюракратаў, лодыраў, недастойных. Паміж гэтай нашай выбарчай барацьбой і барацьбой партый пры выбарах у буржуазны парламент — прынцыповая розніца.

Там у капіталістычных краінах, — барацьба паміж процілеглымі і непрымірымымі класамі, прычым пануючы клас — буржуазія — прымае ўсе даступныя яму меры націску, карупцыі, запалохвання, ідэалагічнага ўздзеяння праз прадажную прэсу, праз царкву, каб захаваць свае прывілеі і ўладу. А кзлі гэтых мер аказваецца недастаткова, на сцэну выступае адкрытая тэрарыстычная дыктатура — фашызм.

У нас, у СССР, — максімальна свабодны адбор лепшых з лепшых совецкіх людзей, адлюстроўваючых як агульныя інтарэсы ўсяго народу, які імкнецца пабудаваць комунізм, так і спецыяльныя (але не процілеглыя) інтарэсы асобных праслоек совецкага народу — рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі. І няма сярод гэтых праслоек ніводнай, чые карэнныя інтарэсы не супадалі-б з інтарэсамі ўсіх астатніх, з інтарэсамі пабудовы комунізма і абароны соцыялістычнай радзімы.

«Пабудаваў ты ці не пабудаваў добрую школу? Палепшыў ты жыллёвыя ўмовы? Ці не бюракрат ты? Ці дапамог ты зрабіць нашу працу больш эфектыўнай, наша жыццё больш культурным? Такія будуць крытэрыі, з якімі мільёны выбаршчыкаў будуць падыходзіць да кандыдатаў, адкідваючы негодных, выкрэсліваючы іх са спісаў, вылучаючы лепшых і выстаўляючы іх кандыдатуры. Так, выбарчая барацьба будзе ажыўленай, яна будзе працякаць вакол мноства астрэйшых пытанняў, — галоўным чынам пытанняў практычных, маючых першаступеннае значэнне для народу. Наша новая выбарчая сістэма надцягне ўсе ўстановы і арганізацыі, прымусіць іх палепшыць сваю работу. Усеагульныя, раўныя, прамыя і тайныя выбары ў СССР будуць хлыстом у руках насельніцтва супроць дрэнна працуючых органаў улады. Наша новая совецкая канстытуцыя будзе, па-мойму, самай дэмакратычнай канстытуцыяй з усіх існуючых у свеце» (**Сталін**).

Соцыялістычнае грамадства ёсць першая стадыя комунізма. У нас яшчэ існуе і яшчэ доўга будзе існаваць «некаторая маемасная няроўнасць» (**Сталін**), залежная ад рознай аплаты працы розных кваліфікацый і рознай ступені напружанасці. «Але ў соцыялістычным грамадстве ўжо няма беспрацоўя, ужо няма эксплуатацыі, ужо няма прыгнечання нацыянальнасцей». Грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці і планавае вядзенне народнай гаспадаркі ствараюць усе ўмовы для бystрага росту грамадскага багацця, для заможнага і культурнага жыцця **ўсяго народу.** Таму соцыялістычная сістэма стварае ўмовы для сапраўднай асабістай свабоды кожнага працоўнага, для росквіту індывідуальных здольнасцей і дараванняў.

«Сапраўдная свабода ёсць толькі там, дзе знішчана эксплаатацыя, дзе няма прыгнечання адных людзей другімі, дзе няма беспрацоўя і жабрацтва, дзе чалавек не дрыжыць за тое, што заўтра можа страціць работу, жыллё, хлеб» (**Сталін**).

Ці можа быць больш наглядны доказ таго, што ў нашай краіне працоўныя сапраўды свабодны, чым стахановскі рух? Ці-ж не б'ецца ў гэтым руху струмень сапраўднай творчасці, на якую здольны толькі людзі, адчуваючыя сябе свабоднымі? Творчы парыў ахапляе мільёны працоўных. Мы бачым такія выдатныя рэзультаты гэтага творчага парыву, як дасягненні нашага чыгуначнага транспарту, які пад кіраўніцтвам свайго жалезнага наркома Л. М. Кагановіча ўжо ў першым квартале 1936 года даў сярэднесутачную нагрузку ў 80 тыс. вагонаў.

Актыўнасць мільёнаў працоўных накіравана супроць бюракратаў і галавацяпаў, няздольных кіраваць грамадскімі справамі ў Совецкім Саюзе. У першую чаргу жорсткі агонь самакрытыкі павінен быць накіраван супроць дазарганізатараў стахановскага руху, супроць бюракратаў, «чалавекаў у футлярах», якія яшчэ не вывеліся сярод нашых гаспадарнікаў і адміністратараў. Разгорнуты совецкі, соцыялістычны дэмакратызм яшчэ больш дапаможа вылучаць на кіруючую работу самых вартых з совецкіх людзей.

У той час як у краінах фашызма сякера і плаха замянілі буржуазны парламенцкі лад, у Саюзе Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік расцвітае новая эпоха совецкай дэмакратыі.

Новая канстытуцыя нашай соцыялістычнай, сапраўды народнай дзяржавы, асноўныя рысы якой ужо вядомы, з'явіцца выдатным дакументам сталінскай эпохі. Яшчэ гарачэй закіпіць жыццё ў соцыялістычнай краіне, і народы нашай радзімы пад вадзіцельствам вялікага Сталіна яшчэ быстрэй пойдуць на шляху соцыялізма да новых і новых перамог!

(**«БОЛЬШЭВІК» № 8**).

НА ГАРАДСКІЯ ТЭМЫ

АБ ПІВЕ, КВАСЕ І ВАДЗЕ

— Квас ёсць?
— Быў, але зараз няма.
— Піва ёсць?
— Няма.
— Калі будзе?
— Невядома, здаецца, к вечару прывязуць.

Такія «дыялагі» адбываюцца ў крамах і ларках Менска амаль кожны дзень.

У чым справа? Няўжо пасля першых веснавых дзён і асабліва пасля першамайскага свята, калі на працягу трох дзён літаральна немагчыма было купіць прахладжальных напіткаў, гандлюючыя арганізацыі не зрабілі з гэтага патрэбных для сябе вываду?. Сумна, але справа абстаіць іменна так.

Белбродтрэст — асноўная ў горадзе арганізацыя па снабжэнню напіткамі — мусіць забыў леташнія ўрокі і зноў робіць галавацяпства. Толькі гэтым можна тлумачыць такое белбродтрэстаўскае планаванне, як вываз... квасу ў іншыя раёны. (Хіба яго нельга рабіць на месцы).

Гандлюючыя арганізацыі скардзяцца на пастаўшчыкоў. Горнутгандаль (т. Саф'ян) «нажымае» на Белбродтрэст (дырэктар т. Карандзей) і піша дакладныя запіскі горсовету. Горсовет (старшыня тав. Жуковіч) піша дакладныя запіскі вышэйшым органам. Усюды даказваецца, што гандлёвая сетка ў параўнанні з мінулым годам павялічваецца, попыт узрастае, а горад атрымлівае піва менш як раней, газаванай вады мала, бо не хапае балонаў, вуглекіслага газу і т. д.

Можа ўсё гэта і правільна, але усё-ж трэба прызнаць зусім неяпрымымі саноўна-панскія, бюракратычныя адносіны гандлюючых і снабжаючых іх арганізацый да забеспячэння насельніцтва Менска прахладжальнымі напіткамі.

Час ужо ўрэшце (май на выходзе) спыніць непатрэбную папяровую перастрэлку і шматлікія размовы «аб значэнні і карысці сельтэрскіх вод» і неадкладна наладзіць бесперабойны гандаль напіткамі ў крамах, ларках і ў развозку.

НОВЫЯ ПАРОДЫ ДРЭЎ У ЛЯСАХ БССР

ГОМЕЛЬ, 12 мая. (Кар. «Звязды»). Беларускі навукова-даследчы інстытут лясной гаспадаркі з вясны гэтага года пачаў вопыты па ўкараненню ў лясах БССР новых відаў парод дрэў. На апорных пунктах інстытута — у Жорнаўцы (Асіпавіцкі раён), Горках, у гомельскім леспрамгасе і інш. — высаджаны пароды хутка растучага канадскага топаля, амурскага бархата, чырвонага дуба, манчжурскага арэха, коркавага дуба, амерыканскага цукровага клёна і інш.

Калгасніца калгаса «Чырвоны барацьбіт», Горкаўскага сельсовета, Чэрвеньскага раёна, Ладуцька В. згодна сталінскага статута сельгасарцелі атрымала водпуск па цяжарнасці. НА ЗДЫМКУ: Ладуцька В. здае чывае ў садзе. Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

ДОМ І-ГА З'ЕЗДА РСДРП АДКРЫТ ДЛЯ ЭКСКУРСІЙ

У Менску па Совецкай вуліцы, № 163, адкрыўся для масавых экскурсій дом, у якім у 1898 г. адбываўся першы з'езд РСДРП. Дом амаль поўнасцю рэстаўраваны.

Музей рэвалюцыі БССР выставіў у пакоях дома шматлікія дакументы і матэрыялы, якія характарызуюць гісторыю рабочага руху ў Расіі. За кароткі час дом наведала каля 500 экскурсантаў—рабочых, студэнтаў, ваеннаслужачых з розных гарадоў і раёнаў БССР.

50-ГОДДЗЕ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ АКАДЭМІКА КУЛАГІНА

17 мая ў Маскве ў Доме вучоных адбылося ўрачыстае пасяджэнне навуковых і грамадскіх арганізацый, прысвечанае 50-годдзю навукова-педагагічнай дзейнасці члена Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна і Беларускай Акадэміі Навук акад. А. М. Кулагіна. У адзнаку юбілею раду лабараторый Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта і Тіміразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі прысвоена імя юбіляра. Устаноўлены дзве павышаныя стыпендыі імя акадэміка Кулагіна на біялагічным факультэце Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта і дзве стыпендыі ў Тіміразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі.

МАСКОЎСКІ МІЖНАРОДНЫ ШАХМАТНЫ ТУРНІР

ЧАЦВЕРТЫ І ПЯТЫ ТУРЫ

Трэці дзень, які азнаменаваўся выдатнымі ўзорамі шахматнай творчасці, відаць, стаміў удзельнікаў турніру. У 4-м туры яны былі настроены больш мірна. Ужо к перапынку тры партыі скончыліся ўнічыю.

Першымі спынілі сваю барацьбу **Батвінік і Элісказес.** Іграючы чорнымі абарону Німцовіча, чэмпіён СССР вышаў з дэбюту з больш свабоднай ігрой. Аднак, чэмпіёну Аўстрыі многімі разменамі ўдалося ўрачыць ігру і дабіцца нічыёй на 31-м ходзе.

Незадоўга да перапынку скончылася барацьба **Руміна з Ліліенталем.** Праціўнікі згадзіліся на нічыю на 27-м ходзе.

У партыі **Кан — Ласкер** (артадаксальная абарона ферзевага гамбіта) чорныя атрымалі ў міттэльшпілі мінімальную перавагу (тры пешкі супроць двух на ферзевым флангу). Аднак маспітаму эксчэмпіёну не ўдалося рэалізаваць сваю нязначную перавагу, і гэта партыя таксама скончылася ўнічыю.

Многа перажыванняў даставіла глядачам партыя **Капабланка — Рагозін** (абарона Німцовіча). Пры пераходзе ў міттэльшпіль Рагозін афяраваў пешку для стварэння атакі, але ў далейшым выбраў няверны план. Эксчэмпіён свету правільнай абаронай прадухіліў усе пагрозы і перавёў партыю ў эндшпіль з лішняй пешкай. К перапынку ігра была прарвана. У Рагозіна меліся некаторыя шансы на нічыю.

Барацьба паміж **Флорам** (белыя) і **Левенфішам** была таксама прарвана да перапынку.

***

У пятым туры з совецкіх майстроў толькі адзін **Левенфіш** сустрэўся з замежным гросмайстрам **Капабланкай.**

Гэта партыя (артадаксальная абарона) скончылася нічыёй на 33-м ходзе.

Значна раней скончылася партыя **Ласкер — Флор.** Флор прыняў востры дэбют — абарону Алёхіна. Аднак, доктар Ласкер спакойна аднёсся да дэбютнай стратэгіі Флора. У далейшым Флору прышлося іграць вельмі дакладна, каб атрымаць нічыю.

Шмат чакалі аматары вострай шахматнай барацьбы ад сустрэчы двух прадстаўнікоў аграсіўнага, востра-камбінацыйнага стылю ігры **Рагозіна і Руміна.**

Чэмпіён Масквы прымяніў у гэтай партыі абарону Німцовіча. На 19-м ходзе праціўнікі згадзіліся на нічыю.

Партыя **Ліліенталь — Элісказес** (абарона Німцовіча) пасля доўгай пазіцыйнай ігры была адкладзена к перапынку з нязначнымі шансамі ў Элісказеса. У эндшпілі ў кожнага было па ладдзі і дзве пешкі. Пасля перапынку, зрабіўшы яшчэ па некалькі ходаў, праціўнікі згадзіліся на нічыю.

Нічыйныя рэзультаты 5 туру былі парушаны гросмайстрам **Батвінікам.** Чэмпіён СССР выбраў белымі абарону Німцовіча, ліквідаваў спробы Кана ўварвацца ў лагер белых і фарсаваў выйгрыш. У заключным становішчы Батвінік меў лішнюю ладдзю і пешку.

***

МАСКВА, 19 мая. (БЕЛТА). 19 мая ў дзень даігрывання няскончаных партый Рагозін, не прыступаючы да ігры, здаў партыі Кану і Капабланку. Партыі Румін—Батвінік і Флор—Левенфіш скончыліся ўнічыю.

Адкрыўся сад „Профінтэрн"

МАСОЎКА, ПРЫСВЕЧАНАЯ ДНЮ ДРУКУ

17 мая адбылося адкрыццё менскага саду «Профінтэрн».

18 мая ў садзе адбылася першая ў гэтым сезоне вялікая масоўка, прысвечаная Дню друку і арганізаваная Сталінскім горрайкомам КП(б)Б, рэдакцыямі газет «Звязда» і «Рабочий». Масоўка пачалася сустрэчай у зялёным тэатры саду пісьменнікаў з партыйным, комсамольскім, профсаюзным і рабселькораўскім актывам Сталінскага раёна. З чытаннем сваіх вершаў выступілі паэты А. Александровіч і І. Харык.

Пачынаецца ўрачыстая частка. Пад бурныя апладысменты пасылаецца прывітальная тэлеграма правадыру народаў, вялікаму і горача любімаму **Сталіну.** Прывітальныя тэлеграмы пасылаюцца тав. Гікало, рэдакцыі «Правды». З дакладам аб Дні друку выступіў рэдактар газеты «Рабочий» тав. Хвіля-Юмскі.

Сад грыміць гукамі аркестраў, гармонікаў, спеваў. На эстрадах выступаюць артысты тэатраў, якія працуюць у Менску. Выступаюць сімфанічны аркестр і дзяржаўная капела радыёкамітэта, музыкі і спевакі кансерваторыі, джаз-аркестр завода імя Варашылава і т. д. 25 масавікоў і 10 баяністаў на пляцоўках праводзяць танцы, гульні, развучваюць песні. На футбольным полі змагаюцца каманды футбалістаў, на веладроме — веласіпедныя гонкі. Весела і добра прайшла масоўка.

***

Сад «Профінтэрн» сёлета лепш падрыхтаваўся да летняга сезона, чым летась. Зроблены добрыя скамейкі, шмат святла. Але ўсё-ж у садзе мала крыніц вяселля. Атракцыёны — «лятаючыя людзі», «сіламер-молат», «кола смеху», — усё гэта, на сутнасці, толькі нясмелыя спробы да таго, каб ажывіць работу саду.

Наша моладзь любіць і паважае парашутны спорт. Чаму-б не пабудаваць у садзе парашутнай вышкі? У садзе мала кветак, але затое шмат пылу. Няўжо немагчыма зрабіць шчыльныя, утрамбаваныя дарожкі?

КРОС ІМЯ ШВЕРНІКА Ў МЕНСКУ

Чырвоны сцяжок старцёра бліснуў у паветры. «Марш!» Дзесяткі ног і рук прышлі ў рух. Бег пачынае група дзяўчат. Вось яны завярнулі за будынак і прапалі з поля зроку. Прайшла толькі мінута — і здалёк паказалася фігура першай бягуні. Яна бяжыць к фінішу, пакінуўшы ззаду некалькі дзесяткаў суперніц. Здалёк чутны воплескі якімі публіка ўзнагароджвае пераможніцу. Гэта — студэнтка медінстытута Грыневіч, чэмпіёнка рэспублікі на кароткіх дыстанцыях, пераможніца ў кросе імя Шверніка ў Менску на дыстанцыі 500 метраў летась. Секундамер фіксуе яе рэзультат — 1 мінута 29,4 сек. Час лепшы, чым у мінулым годзе.

Пабеглі мужчыны. Яны бягуць па бруку плошчы Волі, дзе адбываецца старт і фініш, па клінкеру інтэрнацыянальнай вуліцы, потым па бруку Комсамольскай, паварочваюць налева па брусчатцы Совецкай, імчацца па асфальту Ленінскай зноў на плошчу. Дыстанцыя — 1000 метраў. Лепш за ўсіх прабег Нікалай Байкоў (таварыства «Харчавік») — за 3 мінуты 35,9 сек. Сярод жанчын лепшы час на 1.000 метраў паказала студэнтка мединстытута Данільчык — 4 мін. 23,3 сек.

Першы забег на 5.000 метраў. Маршрут кальцавы: плошча Волі — Ленінская вуліца — Совецкая—Бабруйская—11 ліцея — Свярдлоўская — Карла Маркса Чырвонаармейская — Совецкая — Ленінская — плошча Волі. 3 мінуты на мінуту чакаюць бягуноў. Нарэшце, паказаўся першы. Без бачнай стомленасці ён лёгка падыходзіць к фінішу. 17 мінут 51 секунда — такі рэзультат чырвонаармейца Н-скай часці тав. Марушкіна. Але ў наступным забегу вядомы стайер Менска Іваноў (саюз жыллёвай гаспадаркі) гэту дыстанцыю прайшоў за 16 мінут 28,8 сек.

Адчувалася дрэнная падрыхтоўка да кросу, імя Шверніка, які ў Менску быў праведзен 18 мая. Большасць бегуноў была нетрэніраванай.

І. ЦЫВЕС.

ШАСЕЙНЫЯ ВЕЛАГОНКІ

18 мая ў Менску на Магілеўскай шашы адбыліся шасейныя велагонкі. Пераможцам выйшла першая каманда Менска ў складзе тт. Максімава і братоў А., К., і М. Рапапортаў. Каманда прайшла 50 кілометраў за 1 гадзіну 40 мін. 30 сек. Жаночая каманда Менска прайграла камандзе Бабруйска, якая прайшла 15 кілометраў за 36 мін. 20 сек. Лепшая веласіпедыстка Менска Ліда Андрасюк прайшла 15 кілометраў за 31 мін. 30 сек.

Шасейныя велагонкі прайшлі няўдала, з малой колькасцю ўдзельнікаў. ВСФК БССР праектаваў усебеларускія спаборніцтвы, аднак толькі Менск і Віцебск выставілі каманды.



У гэтым годзе менскі сад «Профінтэрн» капітальна пераабсталёўваецца. На здымку: ілюмінаванне алеяў саду «Профінтэрн». Фото Курсевіча.

НА РЭЧЫЦКАЙ СУДНАВЕРФІ

РЭЧЫЦА, 19 мая. (Кар. «Звязды»). Упершыню ў гэтым годзе рэчыцкая суднаверф Беларускага таварыства садзейнасці воднаму транспарту пачала асвойваць выпуск маторных буксірных і пасажырскіх лодак, суднаў дробнага тонажу для невялікіх рэк, а таксама суднаў непаравога флоту. З пачатку года да сучаснага моманту верф спусціла на ваду 4 буксірныя кацеры, 7 мелка седзячых барж, два карчкраны (для ачысткі рэк), 10 выратавальных шлюпак, 17 суднавых лодак, 2 перапраўныя дубы і паром для рэчыцкага райасвода. У бліжэйшы час верф заканчвае будаўніцтва аднаго пасажырскага і двух буксірных кацераў і інш.

Газетныя радкі

АКАДЭМІКІ, ІНЖЫНЕРЫ, ПЕДАГОГІ

У Осаўскім сельсавеце, Бабруйскага раёна, зпрача дзесяткаў і соцень дзяцей калгаснікаў, якія вучацца ў няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах, да 50 дзяцей калгаснікаў навучаюцца ў вышэйшых навучальных установах Саюза. Сын калгасніка Аляксандра Бебчыка вучыцца ў Ваеннай акадэміі імя Фрунзе, сын калгасніка Міхаіла Бебчыка — у ленінградскім інстытуце інжынераў шляхоў зносін. У калгасніка Мікіты Гарадзецкага сын заканчвае сёлета ленінградскі інжынерна-электратэхнічны інстытут, а дачка вучыцца ў менскім педагагічным інстытуце. («Комуніст»).

НОВЫ КІНОТЭАТР У ПОЛАЦКУ

У Полацку распачата будаўніцтва новага кінотэатра. Будынак будзе двухпавярховы. Зала разлічана на 600 глядачоў. Будаўніцтва кінотэатра будзе скончана к канцу гэтага года. («Большэвік Полаччыны»).

МОЛАДЗЬ— НА САМАЛЁТ!

Менскі цэнтральны аэраклуб імя Молакава абвяшчае прыём у школу пілотаў-планерыстаў канд. маторнага лятання, без адрыву ад вытворчасці.

Прымаюцца комсамольцы і беспартыйная моладзь ва ўзросце ад 16 да 22 год, з асветай не ніжэй сямігодкі. Тэрмін навучання з 15 чэрвеня 1936 г. па лістапад 1937 г.

Паступаючыя павінны прадставіць у менскі аэраклуб (Комсамольская, 25) не пазней 1 чэрвеня 1936 г. наступныя дакументы: заяву, заверaную анкету і дзве фотакарткі, аўтабіяграфію, даведкі аб соцпаходжанні, аб соцстановішчы. Рэкамендацыю і характарыстыку ад камандзіруемай арганізацыі.

АЭРАКЛУБ.

Паведамленні

— 20 мая, у 7 г. вечара, у памяшканні райпартбінета Кагановіцкага РК КП(б)Б (Дом урада, V паверх, левае крыло, пакой 501) адбудзецца нарада дакладчыкаў раённай тэарэтычнай канферэнцыі.

⊙

— 21 мая, у 7 г. вечара, у памяшканні райпартбінета Кагановіцкага РК КП(б)Б (Дом урада, V паверх, левае крыло, пакой 501) для прапагандыстаў па гісторыі ВКП(б) адбудзецца першая лекцыя па геаграфіі. Тэма: Прыродныя багацці СССР.

ПАКРАДЗЕНЫ І ЗГУБЛЕНЫ ПАРТДАКУМЕНТЫ

— Бялыніцкі РК КП(б)Б паведамляе аб пакражы партыйнага білета новага ўзору за № 0860505 на імя Сініцкага Каліграта Пракоф'евіча, выданага Бялыніцкім РК КП(б)Б 27 сакавіка 1936 г.

⊙

— Быхаўскі РК КП(б)Б паведамляе аб пакражы партыйнага білета за № 2403858 на імя Какушко Ірыны Пятроўны (партстаж з 1932 года) і кандыдацкай карткі за № 798 на імя Прахорчыка Аляксандра Яўлевіча (партстаж з 1930 года).

ПАПРАУКА

У загадзе па народнаму камісарыяту асветы БССР, надрукаваным у нумары за 18 мая г. г. дапушчана памылка. У трэцім пункце пастановы, у абзацы «У 7 класе...» у канцы сказу пасля слова «вусныя» трэба ўставіць «працы (у няпоўнай сярэдняй школе)—вусныя».

У тэй-жа пастанове ў 28 радку знізу ў апошняй калонцы замест слова «пункт» павінна быць «курс».

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Памяшканне першага Белдзяржтэатра (тэл. 24-905)

Ад 29 мая — гастролі

Маскоўскага дзяржаўнага тэатра імя народнага артыста рэспублікі

В. С. Мейерхольда

РЭПЕРТУАР:

Сухаво-Кабылін — **СВАДЬБА КРЕЧИНСКОГО**

А. Чэхаў — **33 ОБМОРОКА.**

А. Остроўскі — **ЛЕС**

А. Грыбаедаў — **ГОРЕ УМУ.**

Папярэдні продаж білетаў у касе тэатра з 12 да 2 г. дня і з 5 да 8 г. вечара, і ў доме ўрада (першы паверх, левае крыло) — з 10 да 12 г. раніцы і з 2 да 4 г. дня.

Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 — 20 мая **ЯК ЯЕ ЗАВУЦЬ**

Памяшканне Польскага тэатра (Совецкая, 17, тэл. 25-153) — Гастролі тэатра Чырвонай арміі БВА 20 мая **В. Гусеў. СЛАВА**

„Чырвоная зорка" — Гукавы маст. фільм **Радзіма кліча**

„Пролетарый" — Гукавы маст. фільм **Аднойчы летам**

„Інтэрнацыянал" — Гукавы маст. фільм **Шлях караблёў**

Кіно „Спартак" — Мастацкі фільм **Лунны камень**

Дзіцячы гукавы кінотэатр — Гукавы маст. фільм **ЧАПАЕЎ**

Усесаюзнае аўтатрактарнае аб'яднанне па збыту прадукцыі аўтапрамысловасці **„ВАТОСБЫТ"**

даводзіць да ведама ўсіх аўтагаспадарак, зацікаўленых у атрыманні

ЗАПАСНЫХ ЧАСТАК ДА АУТАМАШЫН,

што на тэрыторыі БССР працуюць наступныя пункты:

1. **Менск,** база (Суражская, 10), аптовая выдача для буйных аўтагаспадарак, 2 і 3 дзень пяцідзённкі.
2. Магазін (Няміга, 2) працуе штодзённа з 10 да 17 гадзін.
3. **Віцебск** (Шасейная, 14), працуе штодзённа з 10 да 17 гадзін.
4. **Гомель** (Гандлёвы двор, 16), працуе штодзённа з 10 да 17 гадзін.

МЕНСКАЯ БАЗА І МАГАЗІН абслугоўваюць раёны: Менскі, Бабруйскі, Магілеўскі, Талачынскі, Барысаўскі, Бярэзінскі, Грэскі, Крупскі, Клічаўскі, Кіраўскі, Пухавіцкі, Бягомльскі, Асіпавіцкі, Глускі, Дзяржынскі, Заслаўскі, Капаткевіцкі, Капыльскі, Лагойскі, Любаньскі, Парыцкі, Плешчаніцкі, Слуцкі, Смалявіцкі, Старобінскі, Старадарожскі, Уздзенскі, Чэрвеньскі, Чырвонаслабодскі і Смілавіцкі.

ГОМЕЛЬСКАЕ АГЕНЦТВА абслугоўвае раёны: Гомельскі, Брагінскі, Быхаўскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Даманавіцкі, Добрушскі, Ельскі, Жлобінскі, Жыткавіцкі, Камарынскі, Кармянскі, Касцюковіцкі, Клімавіцкі, Крычаўскі, Чырвонапольскі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Мазырскі, Нараўлянскі, Прапойскі, Петрыкоўскі, Рагачоўскі, Рэчыцкі, Гураўскі, Церахоўскі, Уваравіцкі, Хоцімскі, Хойніцкі, Чачэрскі, Чэрыкаўскі, Свяцілаўскі і Жураўіцкі.

ВІЦЕБСКАЕ АГЕНЦТВА абслугоўвае раёны: Віцебскі, Асвейскі, Бешанковіцкі, Бялыніцкі, Багушэўскі, Ветрынскі, Гарадоцкі, Горацкі, Дрыбінскі, Дрысенскі, Дубровенскі, Круглянскі, Лёзнянскі, Лепельскі, Мехаўскі, Мсціслаўскі, Полацкі, Аршанскі, Расонскі, Сенненскі, Суражскі, Сіроцінскі, Ушацкі, Халопеніцкі, Чашніцкі, Чавускі, Шклоўскі.

За атрыманнем запасных частак звяртацца ва ўказаныя базы.

БЕЛКАНТОРА «ВАТОСБЫТ».

22 мая, у 7 гадзін вечара, у памяшканні клуба імя Сталіна (рог Інтэрнацыянальнай і Комсамольскай)

адбудзецца пасяджэнне

ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

У ПАРАДКУ ДНЯ—

аб падрыхтоўцы насельніцтва да процівапаветранай абароны.

Білеты на пленум можна атрымаць у горсовеце — пакой 37, III паверх.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

ЦЕНТРОСОЮЗ СССР МОЛОЧНО-МАСЛЯН. ОБЪЕДИНЕНИЕ БССР БЕЛКООПМОЛОКО

БЕЛКААПМАЛАКО

(малочна-маслянае аб'яднанне — БЕЛКААПСАЮЗА) —

даводзіць да ведама ўсіх гандлюючых арганізацый, што

менская, аршанская, віцебская і гомельская маслабазы

праводзяць продаж масла „ЭКСТРА" і іншых гатункаў

усім гандлёвым арганізацыям.

Для атрымання масла звяртацца непасрэдна ў маслабазы па адрасах:

Менская база — Няміга, 9, тэл. 23-686.
Аршанская база — Совецкая, 25, тэл. 38.
Віцебская база — Арлоўская, 36, тэл. 10-64.
Гомельская база — 3-я Рэвалюцыйная, 1, тэл. 109.

БЕЛКААПМАЛАКО.

Ад 1 мая г. г. устаноўлены **НОВЫ ТАРЫФ**

на міжнародныя (заграничныя) пісьмы:

простае пісьмо першыя 20 гр. аплочваюцца 50 кап., наступныя 20 гр. — 30 кап.,

заказное пісьмо да 20 гр. вагавы збор 50 кап., заказ 80 кап., усяго 1 руб. 30 кап.; кожныя наступныя 20 гр. аплочваюцца 30 к., за авіяперасылку да 20 гр. або частку 20 гр. пісьма, бандэролі ці паштовай карткі звыш звычайных паштовых збораў даплата бярэцца ў 1 рубель.

ПАШТОВЫ АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАГА КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ.

ПАТРАБУЙЦЕ

ВА ЎСІХ АПТЭКАХ, У МАГАЗІНАХ САНІТАРЫІ І ГІГІЕНЫ

«СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ» (Выцяжка з семянных залоз). Дазволена НКАЗдароўя. Клінічна выпрабаваны ўмацоўваючы сродак знясілення, упадку сіл, палавога бяссілля і неўрастэніі ва ўсіх яе відах.

«КАРБОЛЕН» Актывізаваны медыцынскі вугаль пры страўнічна-кішэчных захворваннях, узмоцненым бражэнні ў кішэчніку (газаўтварэнні), атручваннях грыбамі і нядобраякаснымі прадуктамі.

«АЛЛИЛСАТ» Карэлізаваная, часночная выцяжка. Дазволена НКАЗдароўя. Рэкамендуецца ўрачамі пры агульным артэрыясклерозе з гіпертоніяй і без гіпертоніі, пры атоніі кішэчніка, калітах са схільнасцю да запораў і пры з'явах сардэчнай астмы.

«ТИОЛАН» (Нафталана-цынкавая мазь). Дазволена Мосздраўаддзелам. Сродак супроць прышчоў, сыпі, каросты, краснаты, зуду скуры і іншых касметычных недахопаў.

«АНЕСТЕЗОЛ» Навейшы сродак супроць гемароя. Знімае боль, зуд, кровацячэнне і ўрэшчыны на слізістай абалонцы тоўстай кішкі.

«ВАГИЛЕН» Вагінальныя процізачатачныя шарыкі. Сродак, які прадухіляе цяжарнасць. Ухвалена камісіяй НКАЗдароўя па барацьбе з абортамі.

Спосаб ужывання пры кожнай упакоўцы.

Пры адсутнасці на месцах звяртацца непасрэдна: Химико-фармацевтическая фабрика «Гален-Москва» Москва, 55, 2-й Вышеславцев переулок, 6.

Менская арцель „ПЕРАМОГА" (Ракаўская, 26, тэл. 21-683)

Мае для продажу:

штучны мёд, яблычнае цеста (пюрэ), дубовыя чаны розных размераў, тарныя скрыні з-пад яблык, дэкстрын для клею, лясны грабавы матэрыял, крухмал II гатунку, кандзіцерская гранітная вальцоўка, машыны для купорні бутэляк, трактар «Фордзон» («Путіловец») і поўны камплект абсталявання для воўначоскі

ПА ДАСТУПНЫХ ЦЭНАХ.

Арцелі САТРЭБЛЬ: возчыкі, чорнарабочыя, бондар, прыбіральшчыцы і некваліфікаваныя работніцы для работы ў цэхах.

ПАТРЭБЕН СТЫЛЬРЭДАКТАР

Звяртацца ў рэдакцыю газ. „ЗВЯЗДА" Менск, Совецкая, 63, III паверх, пакой 7.

ІНСТЫТУТ МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ ПАРТАКТЫВА пры ЦК КП(б)Б

У МАІ, ЧЭРВЕНІ і ЛІПЕНІ 1936 г.

Інстытут перадае цыкл радыёлекцый па пытаннях ПРАГРАМЫ і СТАТУТА ВКП(б).

Радыёлекцыі перадаюцца праз менскую радыёстанцыю імя СНК БССР з 19 г. 30 м. да 20 г. 30 м.

22 мая—Комуністычная партыя—авангард рабочага класа. (Лекцыя т. Кнорына).
28 мая—Як развіваўся капіталізм і чаму неміну́ча яго гібель. (Лекцыя тав. Карпінскага).
7 чэрвеня—Мы змагаемся за соцыялізм, за комунізм. (Лекцыя т. Карпінскага).
14 чэрвеня—Што такое дыктатура пролетарыята. (Лекцыя т. Інгулава).
21 чэрвеня—Як большэвікі вырашылі нацыянальнае пытанне. (Лекцыя т. Бутковай).
28 чэрвеня—Советы — органы дыктатуры пролетарыята. (Лекцыя т. Вышынскага).
4 ліпеня—Як будуецца партыя большэвікоў. (Лекцыя т. Інгулава).
9 ліпеня—Статут ВКП(б) аб абавязках членаў партыі. (Лекцыя т. Яраслаўскага).

ТАВАРЫШЫ!

Для паглыбленага вывучання праграмы і статута ВКП(б) запісвайцеся на арганізаванае слуханне лекцый у радыёаўдыторыях, дзе пасля лекцый для слухачоў арганізуюцца кансультацыі прапагандыстаў і выкладчыкаў.

Даведкі аб месцазнаходжанні радыёаўдыторыі і іншых пытаннях завочнай партвучобы атрымаеце ў райкомах КП(б)Б, у райінструктароў па завочнаму партнавучанню.

Пытанні, заўвагі і водзывы аб праслуханых радыёлекцыях просьба накіроўваць па адрасу: г. Менск, вул. К. Маркса, 47/30, ІМЗО пры ЦК КП(б)Б.

ДЫРЭКЦЫЯ ІМЗО.

Аб'ява аб рэгістрацыі

НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТТАМ ФІНАНСАЎ БССР,

на падставе палажэння і правіл аб дзяржаўнай рэгістрацыі (Зборнік законаў і распараджэнняў урада СССР 1931 г., № 8, ст. 99 і Бюлетэнь фінансавага і гаспадарчага законадаўства 1931 г. № 12).

15 мая 1936 г. зарэгістравана ў рэестры дзяржаўнай рэгістрацыі пад № 201-26

Беларускі рэспубліканскі трэст дрэваапрацоўчай прамысловасці.

Адрас: гор. Менск Комунальная, 3; тэлеф 23.697.

Разліковы рахунак № 98015.

НАРКАМФІН БССР.

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № К—88.